беларуская газэта. Заснаваная ў 1906 г. у Вільні. Адноўленая тамсама ў 1991 г. як штомесячнік. З 1 сакавіка 1996 г. выходзіць у Менску штотыднёва

# НАША НІВА

№ 21(59)
19 жніўня 1996 г.
панядзелак

выходзіць у панядзелкі

КУЛЬТУРА, ПАЛІТЫКА
ТЭЛЕПРАГРАМА
БІРЖА ПРАЦЫ

Зянон Пазьняк:

## «У Беларусі ідзе вайна»

*Як вядома, старшыня БНФ Зянон Пазьняк і прэс-сакратар Фронту Сяргей Навумчык зьвярнуліся да ўладаў ЗША з просьбай аб палітычным прытулку і сёньня чакаюць вынікаў свайго звароту. Наш карэспандэнт Алег Дашкевіч зьвязаўся праз тэлефон з З.Пазьняком і задаў яму некалькі пытаньняў.*



**«НН»: Якія вынікі Вашага звароту аб палітычным прытулку ?**

З.П.: Адразу гэта ня робіцца, цяпер наш зварот на разглядзе ў Дзяржэпартамэнце, але нам вядома, што амэрыканскія ўлады паставіліся да нашай просьбы досыць станоўча. Зь іншага боку мы маем інфармацыю, што расейскія палітычныя колы робяць захады, каб нашую просьбу не задаволілі. У гэтым самым кірунку працуе і беларуская дыпляматыя. Яны разумеюць, што прыйдзецца даваць пэўныя тлумачэньні аб тым рэжыме, які яны ўстанавілі ў Беларусі.

**«НН»: У чым канкрэтна выяўляецца расейскі ціск і захады Міністэрства Замежных Справаў РБ?**

З.П.: У такіх справах звычайна не фігуруюць прозьвішчы канкрэтных людзей. Я проста ведаю, што такія захады робяцца. Афішаваць іх няма сэнсу, тым больш цяпер, калі ўвесь сьвет пабачыў, што такое рэжым Лукашэнкі, калі скандал ідзе за скандалам. Гэта, што тычыцца Расеі. Беларускае МЗС адкрыта супрацьдзейнічае таму, каб мы атрымалі статус палітычных уцекачоў. Праз заявы, празь дзеяньні пасольства РБ у ЗША і асабіста пасла Мартынава. Гэта і зразумела, бо надта вялікія будуць выдаткі для рэжыму.

**«НН»: Як паўплывае на палітычнае становішча Беларусі станоўчы альбо адмоўны адказ на Вашую просьбу: дадуць ці не дадуць Вам палітычны прытулак?**

З.П.: Наконт таго, што не дадуць, думаю, мовы няма. Станоўчае рашэньне засьведчыць, што міжнародная грамадзкасьць прымае сытуацыю, якая склалася ў Беларусі, да сваёй увагі. Калі не адбудзецца нейкіх палітыканскіх нечаканасьцяў, на працягу гэтага месяца мусіць быць прынята станоўчае рашэньне.

**«НН»: Ці ў дастатковай ступені амэрыканцы валодаюць інфармацыяй пра рэжым Лукашэнкі і ці сур'ёзна да яе ставяцца?**

З.П.: Перад тым, як мы прымалі сваё рашэньне, на працягу тыдня практычна ўвесь сьвет гаварыў пра становішча ў Беларусі, інфармацыя ішла кожны дзень і ў амэрыканскіх газэтах, і ў іншых.

**«НН»: Калі Вам дадуць палітычны прытулак, Беларусь для міжнароднага супольніцтва патрапіць у шэраг краінаў, дзе сур'ёзна парушаюцца правы чалавека, кшталту Кубы, Іраку, Паўночнай Карэі. Ці значыць гэта, што аўтаматычна Беларусь апынецца перад пагрозаю санкцыяў з боку Захаду?**

*Працяг на староньцы 2.*




## Беларусь – Нідэрлянды



Адбываецца міжнародны эканамічны абмен. Што, як Вы мяркуеце, пастаўляе Каралеўства Нідэрлянды ў Рэспубліку Беларусь? Прадукты хімічнай вытворчасьці. А што, на Вашу думку, Беларусь пастаўляе ў Галяндыю? Таксама прадукты вялікай хіміі. Туды хімія, сюды хімія. Такая вось дыпляматыя...

Знаёмства зь Нідэрляндамі і гутарка з культурным аташэ пасольства гэтай краіны Каспарам Вэльдкампам — на староньцы 3.

## Рэфэрэндум для сябе

Прэзыдэнт А.Лукашэнка мае намер правесьці ўвосені яшчэ адзін свой рэфэрэндум. Якое значэньне будзе мець чарговы плебісцыт для Беларусі? Напэўна такое самае, як і ўсе папярэднія. Каб зразумець гэта, трэба спачатку самому сабе адказаць на наступныя пытаньні:

1. Які вынік меў для нас гарбачоўскі рэфэрэндум (1990), на якім беларускі народ выказаўся за захаваньне СССР? СССР не існуе.

2. Якія станоўчыя наступствы для сытуацыі ў нашай краіне меў папярэдні лукашэнкаўскі рэфэрэндум (травень 1995)? Сьцягі памянялі, увялі расейскую мову, інтэграцыя з Расеяй засталася на паперы, а прэзыдэнт так і не скарыстаўся правам разганяць Вярхоўны Савет.

3. Чаго не хапае сёньня прэзыдэнту А.Лукашэнку? Улады? Мудрасьці? Культуры? Што да ўлады, то за два гады прэзыдэнцтва ніхто ані разу не спыніў прэзыдэнта, нават калі ён дзейнічаў супраць Канстытуцыі і законаў. Што да ўсяго астатняга, тое яно не даецца на рэфэрэндумах.

4. А.Лукашэнка сёньня, безумоўна, знаходзіцца на вяршыні ўлады і ўласнай палітычнай кар'еры. Чаго-небудзь яшчэ большага чакаць ад яго не даводзіцца. Гэта значыць, што ён задае ўзровень існаваньня грамадзтва на ўсе гады свайго прэзыдэнцтва. ЯМУ лепей быць ужо ня можа. А нам? Ці хачу я, каб мае дзеці таксама жылі пры Лукашэнку – так, як жыву я?

Сумленнага адказу на гэтыя чатары пытаньні будзе дастаткова, каб зразумець, што новы рэфэрэндум, таксама як і папярэднія, ня будзе мець ніякага практычнага значэньня. На тры з чатырох пытаньняў прэзыдэнт чакае ад сваго народу адмоўных адказаў – супраць незалежнасьці, продажу зямлі і адмены сьмяротнае кары. На адно пытаньне – пра новую Лукашэнкаву канстытуцыю – адказ мусіць быць станоўчы. Словам, ці згодныя вы, каб усё было так, як ёсьць?

## 100 беларускіх кніг XX стагодзьдзя

24 чэрвеня «Наша Ніва» надрукавала сьпіс ста найлепшых кніжак XX стагодзьдзя. Гэты сьпіс быў складзены супрацоўнікамі Нью-Ёрскай Публічнай Бібліятэкі, і ахопліваў кнігі ўсяго сьвету і ва ўсіх сфэрах жыцьця чалавецтва. У канцы сьпісу мы прапанавалі нашым чытачам стварыць свой сьпіс — ста найлепшых беларускіх кніг XX стагодзьдзя. Сёньня рэдакцыя ўжо атрымала некалькі лістоў з прапановамі. Нехта называе ўсе сто кніг, нехта толькі палову, а нехта і ўвогуле ўсяго адну. Рэдакцыя «НН» разьлічвае да канца гэтага году атрымаць шмат чытацкіх прапановаў, зьвесьці іх у адзіны сьпіс Ста Лепшых Беларускіх Кніг Стагодзьдзя і на Каляды апублікаваць гэты сьпіс. Той чытач, чыя прапанова найбольш супадзе з выніковым сьпісам, атрымае ад рэдакцыі каштоўны падарунак.

*Працяг тэмы – на староньцы 15.*

## навіны 1-м сказам

*навіны 1-м сказам*

**КОСМАС.** У мінулую суботу расейцы запусьцілі касьмічны карабель, на борце якога акрамя расейцаў ёсьць яшчэ француская астранаўтка.

**ЧАЧЭНІЯ.** Чачэнцы занялі Грозны і цяпер вядуць перамовы з сакратаром савету бясьпекі Расеі А.Лебедзем.

**ВЫБАРЫ.** А.Лукашэнка выказаўся супраць давыбараў дэпутатаў, якіх не хапае ў Вярхоўным Савеце; Цэнтральная Выбарчая Камісія прызначыла давыбары на 24 лістапада.

**ПІВА.** Беларускія мытнікі сканфіскавалі ў даход дзяржавы 432 тыс. літраў піва «Баварыя», што празь Беларусь траспартавалася па чыгунцы ў Расею.

**САТАНІСТ?** Па падазрэньні ў прыналежнасьці да нядаўняга апаганьваньня праваслаўнага Сьвята-Духава Катэдральнага сабору ў Менску сатанінскімі надпісамі супрацоўнікі крымінальнага вышуку затрымалі навучэнца 1-га курсу менскага ПТВ №24 17-гадовага Сяргея Багатырова.

**«ГАРЫЗОНТ».** Менскі завод «Гарызонт» распачаў вытворчасьць новай мадэлі аднайменнага тэлевізара маркі 655-4 пры старым кошце ў 255 даляраў.

**ЯГАДЫ.** Распараджэньнем старшыні Менскага аблвыканкаму на тэрыторыі вобласці ўстаноўленыя тэрміны збору лясных ягадаў: брусьніц – з 17 жніўня, журавін – з 7 верасьня.

**УЦЯКЛІ.** Сямёра расейскіх пілётаў, што знаходзіліся ў палоне апазыцыйнай афганскай групоўкі «Талібан», уцяклі на траспартным самалёце ў Аб'яднаныя Арабскія Эміраты.

**ХЛЕБ.** Кароль Ярданіі Хусэйн паабяцаў «жалезнай рукой» падавіць народны бунт, што ўспыхнуў з-за падвышэньня ўдвая цэнаў на хлеб, і ўжо распусьціў ніжнюю палату парлямэнту, частка дэпутатаў якога выступіла супраць такога падвышэньня.

**ЛЕВЫ БУНТ.** У Сэуле адбыліся жорскія пабоішчы паміж паліцыяй і падбухторанымі паўночнакарэйскай камуністычнай прапагандай паўднёвакарэйскімі левымі студэнтамі, якія патрабуюць неадкладнага ўзьяднаньня дзьвюх частак Карэі.

**ВЫБАРЫ II.** У ЗША ў прэзыдэнцкую гонку ўключыліся два кандыдаты: Боб Доўл ад Рэспубліканскай партыі і мільярдэр Рос Пэро, які дзеля гэтага стварыў альтэрнатыўную Партыю Рэформаў, выдаткаваўшы на яе 6 млн. даляраў.

**КАМБОДЖА.** Адзін з былых лідараў «чырвоных кхмэраў» Ен Сары, які перабег на бок ураду, паведаміў, што ягоны былы паплечнік Пол Пот, пра сьмерць якога паведамлялі раней, жывы.

**АДАМОВІЧ.** На пачатку мінулага тыдня Славамір Адамовіч быў этапаваны са сьледчага ізалятара КГБ у Менску ў сьледчы ізалятар Віцебску, дзе ён мусіць знаходзіцца няпэўны час да пачатку судовага працэсу.

Рэпартаж

## У пошуках няіснага анкляву

Анкляў – частка тэрыторыі адной дзяржавы, цалкам акружаная тэрыторыяй іншай дзяржавы. Беларуская Энцыкляпэдыя прыводзіць у прыклад нейкую Анголу. Быццам не заўважаючы ўласнага прыкладу. А я заўважыў.




Гадоў дзесяць таму я заўважыў на мапе нашай краіны каля Добруша гэтую плямку, злучаную стрэлкай з тэрыторыяй тагачаснай РСФСР. Прычым тады мне да яе не было ніякай справы. Ну падумаеш – бранскія калгасьнікі засеялі наша поле. Сёньня ж самое існаваньне гэтай «Малой зямлі» з двух вёсак пры наяўнасьці за мяжой зямлі Вялікай не давала мне спакою. І ніхто ня мог толкам распавесьці, што гэта такое, Сенькава й Мядзьвежае – расейскія паселішчы ў Беларусі ці беларускія вёскі пад юрысдыкцыяй суседняй краіны? Энцыкляпэдыі маўчалі. Абазнаныя прыяцелі будавалі вэрсіі: ад стараверскіх сёлаў часоў Вялікай Літвы да нейкіх «нядаўніх выселак з гораду Злынка». Навошта тых няшчасных злынцаў выслалі ў БССР ці наадварот, чаму старавераў у ім не пакінулі, мне было незразумела. Але, як бы там ні было, а ажно дзьве вёскі жывуць пад сваім сьцягам, ніяк не залежныя ад Галоўнага калгасьніка. Можа нават ужо й без калгасаў, але абавязкова з галоўным атрыбутам першай зайздрасьці беларускіх калгасьнікаў – расейскімі грашыма. А можа й зь людзьмі прызыўнога ўзросту? Цікава, як ім адсюль бачыцца тая Чачэнія? А як яны прагаласавалі? І ў якой увогуле краіне яны жывуць? І як глядзяць на нас?.. Пытаньні, адказы на якія ляжаць у двух кроках.

*Працяг на староньцы 2.*

# Шэрыя часы

Я выдатна памятаю, як тры гады таму, пры чытаньні «Аўтабіяграфічных нататак» Борхеса мяне зьдзівіла зьмена рытмікі Борхесавага тэксту. Блёк пра кафкіянскую стылістыку «Бабілёнскай вежы» раптам пераламіўся фразаю: «У 1946 годзе да ўлады прыйшоў прэзыдэнт, чыё імя я не хачу называць». Хутка пісьменьнік атрымаў паведамленьне пра сваё «падвышэньне» — зь бібліятэкі яго пераводзілі на пасаду інспэктара гандлю птушкаю на гарадзкіх кірмашах. Борхес накіраваўся ў мэрыю высьвятліць, што ўсё гэта азначае. «Паслухайце, — сказаў ён, — досыць дзіўна, што сярод многіх супрацоўнікаў бібліятэкі менавіта мяне палічылі годным гэтае новае пасады». «Дык што ж, — адказаў чыноўнік, — вы ж былі прыхільнікам заходніх хаўрусьнікаў, чаго ж вы чакалі?» «Цяпер я стаў беспрацоўным».

Ня будзем праводзіць вельмі простыя паралелі, але чым падобная Аргентына ў пэрыяд дыктатуры Пэрона да Беларусі 90-х гадоў, дык гэта аўраю анэкдатызму вакол рэжыму. Спэцыфічнаю рысаю рэжыму ў Аргентыне было тое, што нават афіцыйныя яго прыхільнікі намякалі, што яны ня ставяцца сур'ёзна да гэтага ўраду, але служаць яму проста з карысьлівых інтарэсаў. «Гэткае было зразумелым і даравалася, бо большасьць маіх суайчыньнікаў дастаткова разьвітыя ў інтэлектуальным, калі не ў маральным, пляне». Амаль усе непрыстойныя показкі пра Пэрона й ягоную жонку складаліся самімі ж пэраністамі, якія спрабавалі такім чынам уратаваць свой імідж. У тыя гады за Борхесам пастаянна хадзіў «хвост», якога пісьменьнік спачатку ўводзіў у доўгія, бязмэтныя вандроўкі. Урэшце яны пасябравалі. Шпег прызнаўся, што ненавідзіць Пэрона, але, маўляў, мусіць падпарадкоўвацца загаду.

Была ўсё ж адна важная рыса ў стаўленьні Борхеса й ягонага кола да рэжыму, якая выглядае сьвежаю на тле беларускай сытуацыі й паводзінаў беларускай інтэлігенцыі. Аднойчы Хорхе Луісу прапанавалі прадставіць яго Нязручнавымоўнаму (Борхесава вызначэньне), але Борхес не захацеў зь ім сустракацца. «Як я мог падыйсьці да чалавека, якому ні ў якім разе не пацісну руку».

Галоўным жа эмацыйным адчуваньнем пэрыяду рэжыму Пэрона была шэрасьць часу. У сваёй малечкай навэле «Марцін Ф'ера» Борхес напіша, што «дыктатура прынесла многім турму й сьмерць, а астатнім — трывогу, штодзённы прысмак ганьбы й неадступнае прыніжэньне... Сон аднаго ўвайшоў у памяць усіх».

Набліжаючыся да такіх шэрых часоў, Беларусь мае два радыкальныя адрозьненьні ад пэраніс цкай Аргентыны. Адно адрозьненьне падкрэсьлівае цьмянасьць нашага становішча, другое — надае нейкую пэрспэктыву.

Да Пэрона аргентынская культура ўжо прайшла пэрыяд самавызначэньня. Сьпеласьць культуры дазволіла й за Пэронам ствараць культурныя каштоўнасьці, урэшце новыя кнігі пісаў той жа Хорхе Луіс. Аргентынскае таварыства пісьменьнікаў стала адным зь нешматлікіх апірышчаў супраціву дыктатуры. У выніку гэтае таварыства было распушчанае. У Беларусі ж найбольш неакрэсьленыя роля й функцыі менавіта нацыянальнай культуры, яна не зусім гатовая прыняць выклік рэжыму.

Але адначасова ў Беларусі падымаецца гарачая тэмпэратура нараджэньня нацыі, яе экспансіі на нацыянальнай тэрыторыі. Гэтыя працэсы будуць уцягваюць у актыўнае жыцьцё ўсё большую колькасьць людзей, зь якіх народзіцца Новы супраціў аўтарытарнаму рэжыму. Асобна яшчэ раз адзначым малую эфэктыўнасьць і няпоўную адэкватнасьць сытуацыі з боку нацыянальнай культуры, што ўскладняе нацыятворчыя працэсы й эканамічную мадэрнізацыю ў краіне.

Пасьля магчымае перамогі на чарговым рэфэрэндуме рэжым вымушаны будзе распачаць сваю, аўтарытарную мадэрнізацыю, што таксама набліжае беларускую сытуацыю да лацінаамэрыканскай. Вось тут ужо вынікі зусім цяжка спрагназаваць. Аргентына прайшла свой унікальны шлях.

У 1955 годзе ў выніку ўзброенага паўстаньня дыктатура Пэрона пала. У 1972 годзе ў апавяданьні «Другі» Борхес зноў напіша пра правінцыялізм ды самазамілаваньне, якія захліснулі краіну. А ўжо ў наступным годзе гэтая краіна другі раз, але цяпер сама, абірае прэзыдэнтам Пэрона, які вярнуўся з эміграцыі. Борхес, гэты галоўны бібліёграф XX ст., мае што зьдзейсьніць у адказ — ён пакідае пасаду дырэктара Нацыянальнай бібліятэкі, якую заняў пасьля падзеньня першай пэраніс цкае дыктатуры.

**Алег Дзярновіч**

"Наша Ніва"
незалежны тыднёвік
НАША НІВА
заснаваны ў 1906, адноўлены ў 1991
заснавальнік і выдавец Павал Жук
рэдактар Сяргей Дубавец
адказны сакратар Алег Дзярновіч
мастацкі рэдактар Сяргей Харэўскі
навіны Уладзімер Бараніч
рэдактар дадатку "Інфарматар" Андрэй Лапцёнак
макет Віктар Корзун
дызайн і вёрстка Лявон Раманчык
набор Тацяна Чуйвід
стыль Антон Кузьміч
карэктура Сяргей Сматрычэнка пры ўдзеле Сяргея Шупы
прадстаўнік рэдакцыі ў Гомелі Зьміцер Бартосік (тэл. 56-94-36)
**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ**
**220123 Менск, а/с 71**
**Тэл./факс 239-78-49**
**Падпісны індэкс 63125**

Зянон Пазьняк:

# «У Беларусі ідзе вайна»

Працяг са старонкі 1.

З.П.: Не азначае, што аўтаматычна. Але гэты факт дае падставу такое пытаньне паставіць. Уступаюць у дзеяньне міжнародныя капвэцыі і тыя рычагі, якія раней толькі дыскутаваліся ў прэсе. Цяпер жа перасьлед, які чыняць улады ў Беларусі, становіцца прызнаным фактам. Прызнаньне гэтага будзе мець вельмі вялікае значэньне для падтрымкі дэмакратыі і правоў чалавека ў Беларусі. Магчыма палітыкі яшчэ не зусім разумеюць беларускую сытуацыю. Я адчуваю, што ім не хапае досьведу. Але, паўтараю, гэта будзе мець вельмі вялікае значэньне. Спадзяюся, што ў сёньняшніх умовах і мы, са свайго боку, і БНФ, і ўсе людзі добрай волі ў Беларусі будуць працаваць заадно, за вызваленьне нашай Бацькаўшчыны ад гэтага рэжыму, ад зьняважлівых адносінаў да нацыі, ад парушэньня правоў чалавека.

**«НН»: Якія мэханізмы можа задзейнічаць Захад для ўплыву на антынацыянальны рэжым Лукашэнкі?**

З.П. Зьмене адносінаў Захаду да гэтага рэжыму садзейнічалі веснавыя выступленьні людзей у абарону незалежнасьці і дэмакратыі. Але больш за нас наша дэмакратыя нікому не патрэбная. Калі мы махнем на сябе рукой, то і Захад таксама махне рукой. Што тычыцца мэханізмаў узьдзеяньня, то тут нічога новага няма: дыпляматычныя захады ў справе абароны правоў чалавека, магчымасьць выдатканьня крэдытаў, прыём у Раду Эўропы і гэтак далей. Дарэчы, мы з свайго боку робім усё, каб Беларусь як мага хутчэй прынялі ў гэтую арганізацыю. Беларусь нельга пакідаць у ізаляцыі, бо тады рэжым будзе рабіць усё, што заўгодна. Трэба прымаць, ставіць умовы і такім чынам стрымліваць. Калі Беларусь будзе прадстаўлена ў гэтай арганізацыі, увесьці войскі ў парлямэнт будзе значна цяжэй. Гэтую пазыцыю я даводзіў на сустрэчах з кіраўніком дэпартамэнту Ўсходняй Эўропы Рады Эўропы, з кіраўніком адміністрацыі прэзыдэнта Чэхіі і іншымі эўрапейскімі палітыкамі.

**«НН»: Цяпер у Амэрыцы пачалася перадвыбарчая кампанія. Якая з асноўных палітычных партыяў — рэспубліканцы альбо дэмакраты — выяўляе большую цікавасьць да нашай сытуацыі?**

З.П.: Я б такога падзелу не рабіў, таму што няма адзінства і ў самой дэмакратычнай партыі, але што тычыцца правоў чалавека, то ў гэтым пытаньні і рэспубліканцы, і дэмакраты — адзіныя. Гэта грунт, на якім стаіць амэрыканскае грамадзтва.

**«НН»: Як, на Вашую думку, паўплываюць на беларускую сытуацыю, на рэжым Лукашэнкі вынікі прэзыдэнцкіх выбараў у Расеі і тое, што там цяпер адбываецца?**

З.П.: Я думаю, пасьля таго, як расейцы прайгралі вайну ў Чачэніі, усю сваю сілу яны накіруюць на Беларусь. У Беларусі таксама ідзе вайна, толькі іншымі спосабамі. Трэба паважаць саміх сябе, трэба быць салідарнымі, трэба ўмець падтрымаць адзін аднаго ва ўсім сьвеце. Я тут і выступаю за тое, каб аб'яднаць беларусаў усяго сьвету за свабоду нашай Бацькаўшчыны, за дэмакратыю, за правы чалавека, бо цяпер вырашаецца лёс нацыі. Яшчэ не было ў нашай гісторыі такога, каб нацыяй кіраваў вар'ят. Ніхто так не разбурыць дзяржаву, як кіраўнічы вар'ят. Гэта трэба разумець і трэба знаходзіць мэтады і сілы, каб спыніць гэтае вар'яцтва.

**«НН»: Спадар Зянон, ходзяць чуткі, што хутка Вы можаце стаць пераемнікам сп. Язэпа Сажыча на пасадзе Прэзыдэнта БНР...**

З.П.: Магу сказаць, што гэта толькі чуткі, якія ня маюць пад сабой глебы. У нас пакуль хапае працы і кожны будзе рабіць сваю справу. Ідэалы БНР, незалежнасьці Бацькаўшчыны сьвятыя для кожнага з нас, і дзе б мы ні былі, мы будзем памятаць пра іх і змагацца за іх.

**«НН»: Ці ёсьць аб'ектыўныя падставы спадзявацца на тое, што Захад нейкім чынам будзе ўдзельнічаць у лёсе Беларусі альбо аддасьць Беларусь у сфэру расейскага ўплыву?**

З.П.: Вось гэта цяпер і вырашаецца. Захад, здаецца, пачаў разумець, што зрабіў памылку, калі заплюшчыў вочы на дзеяньні рэжыму Лукашэнкі і дазволіў разьбірацца зь ім Расеі. Цяпер, вядома, становішча больш складанае, але апошнія падзеі ў Беларусі, воля народу да незалежнасьці спрыялі таму, каб Захад задумаўся пра становішча Беларусі і ролю нашай краіны ва Ўсходняй Эўропе.

**«НН»: Спадар Зянон. За чый кошт фінансуецца вашае знаходжаньне ў Злучаных Штатах?**

З.П.: Нас падтрымвае беларуская эміграцыя. Натуральна, трэба за нешта жыць, бо мы пакуль не працуем. Я вельмі ўдзячны гэтым людзям, якія даўно выехалі з Бацькаўшчыны, перасьледаваліся бальшавікамі, але праз усё жыцьцё пранесьлі любоў да Айчыны, да мовы, да нацыянальнага сьцягу і цяпер, як могуць, дапамагаюць.

**«НН»: Як Вы глядзіце на сёньняшнюю дзейнасьць БНФ пры Вашай адсутнасьці?**

З.П.: Мы маем сталую сувязь. Што да дзейнасьці Фронту, спачатку не было поўнай арыентацыі, былі вялікія цяжкасьці і Фронт ня змог у першыя месяцы зрабіць нам падтрымку. Гэта прывяло да таго, што кіраўнік Фронту быў вымушаны апынуцца ў эміграцыі. Такую сытуацыю выкарыстаў рэжым. Спэцслужбам было дадзена распараджэньне нэўтралізаваць нас. Нават пачалі публічна прызначаць у Польшчу сваіх рэзыдэнтаў. Так што прымаліся прэвэнтыўныя меры. Характэрна, што выказваньне Ілюхіна ў расейскай Думе выявіла гэтыя пляны. Цяпер я думаю, што Фронт разумее ўсю сытуацыю, якая склалася, і дзейнічае так, як павінен у гэтай сытуацыі. Тут важна не згубіць ніводнага дня. Важна, каб было адзінства дзеяньняў і там, і тут. Зараз пра падзеі ў Беларусі гаворыць увесь сьвет. Гэта значыць, што на карту пастаўлены лёс Беларусі. Трэба бараніць Беларусь разам. У апошні час, здаецца, у Фронце гэта зразумелі і цяпер становішча лепшае. Хачу толькі пажадаць ім посьпехаў і рашучасьці ў іхняй працы.

**«НН»: Шчыры дзякуй за інтэрвію і посьпехаў Вам.**

Рэпартаж

# У пошуках няіснага анкляву

Працяг са старонкі 1

Каб не сумаваць, я вырашыў зрабіць прыемнае свайму старому прыяцелю, таксама маскалю, але яшчэ маскалейшаму. Маўляў, «не жалаеш лі пракаціцца на історычаскую родзіну»? Зразумела, адмовіцца ад гістарычнай радзімы той ня змог.

Якая сумная дарога ад Гомеля на ўсход! Жоўтая роўнядзь пад белым небам, перасечаная вышкамі ЛЭП. Новыя кварталы Добруша наганяюць яшчэ больш сьпякоты й стомы. Што дае сілы тут жыць жыхарам гэтых раскаленых на сонцы дамоў?!

Як хутка паўстала мяжа! Мы не пасьпелі нават зарыентавацца, дзе нам збочыць на тое Мядзьвежае (нармальнай мапы ў нас не было), як апынуліся на ўсходнім посьце дзяржавы. Міліцыянт, які раней добрасумленна спраўджаў адпаведнасьць майго фота маёй фізіяноміі, цяпер не хацеў заўважаць ні нас, ні нашай машыны. Прыйшлося выходзіць, каб запытацца ў яго, як нам патрапіць на тую расейскую тэрыторыю, не перасякаючы гэтых межаў. Толькі пасьля такога пытаньня погляд вартаўніка рэспублікі напоўніўся пільнасьцю і ўсьведамленьнем таго, навошта ён сюды пастаўлены. «А як гэта?» — пытаўся ён пільным поглядам. Калі ж сяк-так удалося растлумачыць яму, што й такое бывае, ён махнуў рукой у невядомым кірунку.

Праехаўшы яшчэ пару мэтраў, мы ўпёрліся ў Расею. У сапраўдную. Дзе далей на ўсход ужо ня будзе ніводнага памежнага паста аж да Вялікага Акіяну. Зразумець гэта лёгка, а вось уявіць ва ўсёй паўнаце — не магу. Варшава й Парыж перад гэтай дзябёлай стэлай зь няроўна выразаным сылюэтам дзьвюхгаловага арла падаюцца бліжэйшымі за Маскву.

Ніякіх паказальнікаў на Мядзьвежае не было, і я збочыў на першую грунтоўку, не надаўшы належнай увагі «кірпічу» з папярэджаньнем аб магчымым штрафе ў дзесяць мінімальных заробкаў. Мы паехалі па нейкім дзікім і дзіўным полі. Зусім непадобным да поля, знаёмага мне з гарачых рэпартажаў БТ зь месца Падзеяў. Вакол не каласілася жыта, ня йшлі стройныя шэрагі камбайнаў, не мітусіліся мэханізатары. Хоць абазваць яго можна было толькі Полем бітвы. Пыльны шлях пачаў пятляць па гэтым Лукамор'і. Шаша зьнікла, лес наблізіўся, а прыкметаў жыцьця пакуль бачна не было. Нават вароны адсутнічалі. Настрой падаў разам са стрэлкай узроўню бензыну. Неверагодных памераў страказа заляцела ў салён, напоўніўшы яго непрыемным гукам бормашыны.

— Радыяцыйныя мутанты пачынаюць наступ, — заўважыў сябра.

— Вунь туды глядзі, нейкая тэхніка тырчыць! — закрычаў я нібы марак, які заўважыў на даляглядзе зямлю. Мы амаль што напрасткі паляцелі да таго аазысу цывілізацыі. Дзясятак паржавелых камбайнаў ды іншых невядомых мне драпежнага выгляду машынаў дагнівалі свой век ужо, відаць, ня першы год.

— Як ты думаеш, для чаго вунь тыя прылады? — запытаўся я.

— Каб з мутантамі змагацца. Але, як бачна, мутанты перамаглі.

— А вунь тымі мутантамі нас кормяць, — я паказаў на статак, што зьявіўся на даляглядзе.

— Ды не, тымі мутантамі кормяць брацкую Расею, — абнадзеіўся сябра.

Праз гадзіну мы ўсё ж выбіліся на асфальт. Які праз імгненьне абступіў вельмі цёмны і вельмі страшны лес. А яшчэ праз імгненьне сярод казачных ялін паказаліся дахі нежывых дамоў. Мы дасягнулі фінішу. Можна было выходзіць. Але выходзіць не хацелася. Гульня ў гасьцінных гаспадароў сваёй краіны не атрымалася. Гульня у няпрошаных гасьцей не прываблівала. Праблема расейскага анкляву, прыдуманая мной, была вырашана тады, калі яшчэ не прыдумалі сувэрэнітэт. І загатаваныя пытаньні можна было пакінуць сабе. Як адсюль бачыцца Чачэнія? У якой краіне жывем? Як глядзім на сябе?..

**Зьміцер Бартосік**

Беларусь — Нідэрлянды

# Дыпляматыя як разьдзел хіміі

### Неабходныя ўстаноўкі:

*1. Часта Нідэрлянды называюць Галяндыяй, хоць насамрэч Паўднёвая і Паўночная Галяндыя — гэта толькі дзьве з дванаццаці правінцыяў Каралеўства Нідэрляндаў. Нідэрлянды ў перакладзе — нізкая мясцовасьць.*
*2. Незалежнасьць Нідэрляндаў усталяваная пасьля 80-гадовай вайны з Гішпаніяй, у 1648 годзе, калі было падпісанае Вэстфальскае замірэньне. Узначальваў барацьбу супраць гішпанскага караля прынц Уільям Аранскі, родапачынальнік Каралеўскага дому Нідэрляндаў.*
*3. Дзяржаўны лад Нідэрляндаў — канстытуцыйная манархія. Разам з Бэльгіяй і Люксэмбургам Галяндыя складае мытны зьвяз БЭНІЛЮКС, а таксама уваходзіць у NATO. У Гаазе месьціцца Міжнародны Трыбунал ААН.*
*4. Адміністратыўны падзел краіны: 12 правінцыяў, 647 муніцыпалітэтаў. Найбуйнейшыя гарады: Амстэрдам, Ротэрдам, Гаага, Утрэхт. Найбуйнейшыя рэкі: Рэйн, Маас і Шэльда.*
*5. У Нідэрляндах больш за 900 музэяў. Людзі да 26 гадоў маюць «Маладзёжны культурны пашпарт» — права на льготнае наведваньне тэатраў, кіно і музэяў, на меншы кошт кампакт-дыскаў, квіткоў на падарожжы, падпіску пэрыёдыкі і г.д. Найбольш вядомыя мастакі — Рэмбрант ван Рэйн і Вінцэнт ван Гог.*


Прынц Вільгельм Аранскі (1533 -1584)

Беларуска-нідэрляндзкія кантакты не рэгулярныя і диктуюцца хутчэй фармальнай прыстойнасьцю (краіны мусяць мець нейкія дачыненьні), чым аб'ектыўнай патрэбай узаемнага выжываньня. Палітычна мы існуем у розных эпохах, паміж якімі тры сотні гадоў (калі адлічваць ад усталяваньня незалежнасьці і так званай буржуазнай рэвалюцыі). Сякі-такі эканамічны абмен можа быць, а можа й ня быць. Што датычыць культуры, то тут наша зацікаўленасьць яшчэ больш аднабаковая: цяжка сабе ўявіць галяндзкага музыку на вуліцах Менску, тады як у Нідэрляндах нашых заслужаных артыстаў з футараламі для гульдэнаў хапае. Адзіная «фора» беларушчыны ў гэтай справе — раман Адама Глёбуса «Толькі не гавары маёй маме» (у газэтным варыянце ён называўся «Амстэрдам»). Наколькі нам вядома, у галяндзкай літаратуры нічога падобнага пра Беларусь не было.

Увогуле нашая цікавасьць адно да адных выглядае вельмі па-рознаму. Мы цяпер, што тыя мятлікі, ляцім на сьвятло багатых краін, ня надта перабіраючы, дзе Галяндыя, а дзе Новая Зэляндыя. Яны ж разглядаюць нас «нэйрахірургічным» зрокам, імкнучыся пралічваць самыя дробныя наступствы кантактаў.

На мінулым тыдні Беларусь наведала нідэрляндзкая эканамічная місія. На 11 кастрычніка рыхтуецца візыт у Беларусь віцэ-міністра замежных справаў Нідэрляндаў Міхеля Патыйна. Гэта будзе найбольш значны такога роду візыт пасьля 1993 году, калі ў Менск прыяжджаў галяндзкі міністар замежных справаў. Вось, бадай, і ўся гісторыя візытаў. Які быў іх вынік і пра што думаюць сёньня ў пасольстве Нідэрляндаў на Хоцімскай вуліцы ў Варшаве, — пра гэта карэспандэнт «НН» запытаўся ў культурнага аташэ Каспара Вэльдкампа.


Каралева Беатрыкс і Крон-Прынц Вільгельм-Аляксандар

**«НН»: Спадар Вэльдкамп, што сёньня ўяўляе зь сябе наш міждзяржаўны эканамічны абмен?**

К.В.: Экспарт з Галянды ў Беларусь летась вырас на 83 працэнты, а сёлета, відавочна, павялічыцца яшчэ ў два разы. Імпарт зь Беларусі вырас на 30 працэнтаў. Увесь гандлёвы зварот паміж краінамі ў 1995 годзе склаў 261 млн. гульдэнаў. Для Беларусі гэта значны паказчык. Для Нідэрляндаў, адной з самых багатых краінаў Эўропы, — амаль нішто.

**«НН»: Што канкрэтна Вы прадаеце нам і купляеце ў нас?**

К.В.: Пераважна гэта імпарт і экспарт хімічных прадуктаў, якія дзеля пэўных стадыяў апрацоўкі прывозяцца з Галянды ў Беларусь.

**«НН»: Ці прыходзяць у беларускую эканоміку буйныя галяндзкія прадпрыемствы?**

К.В.: Менск і Эйндговэн – гарады-прыяцелі. А Эйндговэн –гэта сталіца сусьветна вядомага Philips'а. Philips адчыніў у Менску свой офіс. Сёньня ў Нідэрляндах набіраецца досьведу шмат прадпрымальнікаў зь Беларусі. Едуць таксама і галяндзкія кансультанты ў Беларусь. Праблема ў тым, што наладзіць вытворчасьць паводле высокіх эўрапейскіх стандартаў у асяродзьдзі, дзе самыя жыцьцёвыя стандарты (у тым ліку і адносіны людзей да працы) на досыць нізкім узроўні, вельмі складана.


Ратуша ў Мідэльбурзе.

У такой сытуацыі больш эфэктыўнай можа быць іншая форма супрацоўніцтва, калі дасьведчаны галяндзец не кансультуе беларускіх кіраўнікоў, а сам зьяўляецца кіраўніком або ўладальнікам прадпрыемства. Зразумела, што адносіны работніка да гаспадара зусім іншыя, чым да нейкага там кансультанта. Праўда, у пасольстве занепакоеныя тым, што галяндзкі гаспадар створыць неадэкватную канкурэнцыю аднапрофільным беларускім фірмам і ўласна беларуская вытворчасьць усё адно разьвівацца ня будзе. Таму галяндцы прыдумалі такі варыянт: прысылаць у Беларусь сваіх прадпрымальнікаў зь ліку пэнсіянэраў, якія добра ведаюць вытворчасьць і адначасова не такія гарачыя ў канкурэнтнай барацьбе.

*Параўнаўчая статыстыка нашых краінаў выглядае так: плошча Беларусі — 207.600 кв. км, Нідэрляндаў — 41.547 кв. км; насельніцтва Беларусі — 10.300 тыс., Нідэрляндаў — 15.129 тыс. Прычым пэнсіянэраў у нас 27,3%, у іх — 13%.*

**«НН»: Спадар Вэльдкамп, што агульнага паміж Беларусяй і Галяндыяй?**

К.В.: Гэта малыя краіны Эўропы, дзе аграрная спэцыялізацыя суседзіць зь вялікімі перапрацоўчымі заводамі. Абедзьве краіны транзытныя: Галяндыя – на лініі поўнач-поўдзень, Беларусь – усход-захад.

Пералік падабенстваў можна працягваць. Менавіта Галяндыя выступае ў ролі галоўнага эўрапейскага інтэгратара. 38 працэнтаў насельніцтва Нідэрляндаў не вызнаюць ніякай рэлігіі, а астатнія падзеленыя на каталікоў (30%) і пратэстантаў (25%). Значная частка тэрыторыі краіны знаходзіцца ніжэй за ўзровень мора і таму ўся Галяндыя зазнала мэліярацыю, гэта краіна дамбаў і польдэраў.

Праўда, радыкальна адрозьніваецца сытуацыя нацыянальных моваў у нашых краінах. У Нідэрляндах, дзе ўсё насельніцтва ўвогуле гаворыць або разумее па-ангельску або па-нямецку, афіцыйная мова адна — галяндзкая. Яна родная для больш чым 21 млн. галяндцаў і флямандцаў і займае 30-е месца ў табліцы сусьветнай лігі. У правінцыі Фрысляндыя ў якасьці афіцыйнай выкарыстоўваецца таксама фрыская мова.

**«НН»: Спадар Вэльдкамп, якія Вы назавеце прынцыповыя сутнасныя адрозьненьні паміж нашымі краінамі?**

К.В.: Галяндыя знаходзіцца ў цэнтры Заходняй Эўропы, яна вельмі малая, але ў ёй вельмі шмат людзей. Гэта дапамагае краіне актыўна ўдзельнічаць у сусьветнай эканоміцы. Наша краіна моцная ня танкамі, а ўзроўнем жыцьця кожнага чалавека.

Людзі на Ўсходзе разважаюць у катэгорыях XIX ст. – процівага сілы, перасоўваньне межаў. На Захадзе гэтая энэргія сыйшла на футбольнае поле і ў сфэру эканамічнай канкурэнцыі. У нас іншая, чым у вас, канцэпцыя нацыі. У вас – паводле крыві, у нас – паводле краіны. Канцэпцыя нацыі на Ўсходзе Эўропы больш абапіраецца на мінуўшчыну і менш адпавядае сучаснасьці.


Вінцэнт ван Гог "Едакі бульбы"

Зрабіць выснову пра тое, што Нідэрлянды сапраўды адна з самых багатых краінаў сьвету, гледзячы на яе пасольства і яго прадстаўнікоў, немагчыма. Ніякай вонкавай раскошы, пазалоты або шыку дарагіх рэчаў і вышуканых манераў. Гэта вам ня пышныя амбасады «краінаў СНГ». Між тым вядома, што 1,5 працэнты нацыянальнага прадукту Нідэрляндаў выдаткоўваецца на дапамогу найбяднейшым краінам сьвету. Прыблізна такі ж працэнт свайго бюджэту Беларусь выдаткоўвае на разьвіцьцё ўласнай культуры...

**С.Д.**


Каналы ў [illegible]тэрдама

Міжнародны агляд

# І хітраму, і ўмеламу, і віцязю славянскаму Міжнароднага Трыбуналу не мінуць

І хітраму, і ўмеламу, і віцязю славянскаму Міжнароднага Трыбуналу не мінуць. Так сказаў бы дастаслаўны Баян Радавану Караджычу, калі б быў жывы. Цікава было б правесьці псыхааналіз жалезнага псыхіятра Караджыча цяпер, калі стаў вядомы цьвёрды намер заходніх хаўрусьнікаў і, найперш, амэрыканцаў любымі сродкамі, любой цаной прымусіць Караджыча і Ратка Младыча зьявіцца ў Гаагу ў суд, які мае вырашыць, ці адказныя яны за блякаду Сараева, за равы-магілы, дзе знайшлі сабе апошні прытулак мусульмане Біхача і Жэпы, за бясьсьледнае зьнікненьне тысячаў жыхароў Срэбраніцы. Ангельская прэса апублікавала плян дэсантнай апэрацыі захопу Караджыча і прывяла словы амэрыканскага афіцэра: «Караджыч – не Хусэйн, ён ад нас не схаваецца». Вядома, гэткую «ўцечку інфармацыі» спэцслужбы могуць дапускаць толькі ў палітычных, перадвыбарчых мэтах, і сьведчыць гэта пра адсутнасьць канкрэтных плянаў сёньня. Аднак, здаецца, міжнародная супольнасьць, на шчасьце, зразумела, што адзіны спосаб папярэдзіць прыход да ўлады новых вар'ятаў – не даравашь ніводнага злачынства тых, хто хітрасьцю, умельствам і красамоўствам ужо дамогся ўлады. Межы не павінны спыняць Фэміду.

Ніякія рэфэрэндумы не перашкодзяць суду ўстанавіць праўду. Караджыч быў без параўнаньня віртуозам плебісцытарнай дыктатуры, ладу, калі валадарыць умела кіраваны натоўп, «народныя масы», аморфныя і безаблічныя, а не грамадзтва –праз свае дзесяцігодзьдзямі замацаваныя структуры, інстытуты, абраных прадстаўнікоў, што адчуваюць адказнасьць ня толькі перад «масамі», але і перад гісторыяй, перад дзяржавай як гістарычнай цэласнасьцю, якая існавала і да таго, як «безназоўныя масы», просты народ нарадзіўся на сьвет, і будзе існаваць пасьля, і, нарэшце, адказнасьць перад Богам. Народам прыкрывацца проста. «Народ мяне не зразумее, калі я падпішу пагадненьне аб міры», – заяўляў Караджыч і ладзіў чарговы рэфэрэндум. І вялікі, працавіты, разважлівы народ амаль аднагалосна адказваў у бюлетэнях: «Не». «Вось бачыце, воля народу для мяне закон, я не магу парушыць свае абяцаньні», –абвяшчаў герой Балканаў.

У кастрычніку пачнецца яшчэ адно паседжаньне Міжнароднага Трыбуналу па правах чалавека. Ужо бадай што гатовы абвінаваўчы дакумэнт для суда над вінаватымі ў генацыдзе ў Руандзе ў красавіку 1994 году. Суд адбудзецца ў танзанійскім горадзе Аруша. Тады загінула больш за мільён чалавек: мужчыны і жанчыны, старыя і дзеці. Будуць судзіць перш за ўсё тых высокапастаўленых забойцаў, хто са сьпісамі ў руках мэтадычна зьнішчаў усю інтэлігенцыю, усіх палітыкаў-апазыцыянэраў без разбору: хуту, тутсі... Але дзе ж карэніцца дзікая, унутрыграмадзянская нянавісьць, чаму яна нарадзілася? Калі бэльгійцы, старэйшыя браты руандыйскага народу, занялі «краіну тысячы пагоркаў», яны спачатку вырашылі абапірацца на тутсі, пастухоў, а не на хуту, земляробаў. Яны распаўсюдзілі думку, што тутсі прыгажэйшыя, разумнейшыя, больш прыдатныя, каб кіраваць. Абраных тутсі паслалі вучыцца за мяжу, пра іх клапаціліся, а пасьля вярнулі іх на бацькаўшчыну. Але раптам аказалася, што гэтыя адукаваныя тутсі патрабуюць аўтаноміі, нават незалежнасьці. Тады палкоўнік Гі Лаж'ест, кіраўнік бэльгійскіх сілаў у Конга вылучае новы плян (пра гэтыя жахлівыя разьлікі ён піша ў кнізе, што выйшла ў Бэльгіі). Лаж'ест прапанаваў зрабіць стаўку на хуту, падбухторваць іх супраўць тутсі, падграваць іх крыўды, іх абурэньне мініапартэідам, панаваньнем тутсі, якое ўявілі самі каланізатары. Прызнаўшы незалежнасьць Руанды, на разьвітаньне бэльгійцы пасадзілі прэзыдэнтам краіны неадукаванага хуту, які кіраваў з дапамогай карумпаванай адміністрацыі.



Трэба думаць, неўзабаве будзе скліканы суд і над тымі, хто зьдзейсьніў злачынствы супраць чачэнскага народу. Цяпер, пасьля вызваленьня Грознага, зьяўляецца магчымасьць сабраць дадатковыя сьведчаньні пра жахлівую вайну, што вядуць наёмнікі, якім напляваць на ўсе правы чалавека і на якіх напляваць ураду, што паслаў іх. Але няпраўда, быццам на вайне вінаватых не бывае, няпраўда, нібыта ніхто не аддаваў загаду на захоп Самашак, нібы ніхто не замаўляў «ковровые» бамбардзіроўкі. Кожнаму адплаціцца.

Як адплаціцца эсэсаўцу Эрыху Прыбке, што расстрэльваў людзей у Ардэатынскіх равах у Рыме ў 1943 годзе. Калі трыбунал засудзіў яго не за злачынства супраць чалавецтва, а толькі за наўмыснае забойства, што азначала вызваленьне з-за даўніны злачынства, то Нямеччына й Аргентына запатрабавалі выдаць Прыбке для новых судовых працэсаў, а ў Рыме на Капіталійскай гары адбыўся шматтысячны мітынг пратэсту з удзелам мэра гораду Рутэлі і прэм'ер-міністра Продзі. У знак пратэсту было адключана таксама асьвятленьне фантанаў і архітэктурных помнікаў «вечнага гораду».

Памяць і ўдзячнасьць – два пачуцьці, безь якіх чалавек робіцца зьверам. Кожны раз, чытаючы пра Чачэнію, я з удзячнасьцю згадваю людзей, палітыкаў, дзякуючы якім я, як і усе беларускія хлопцы, сёньня магу не баяцца, што заўтра мяне кінуць гнісьці ў акопы пад Грозны.

Сёньня некаторыя з гэтых палітыкаў нават ня маюць магчымасьці вярнуцца на Бацькаўшчыну, але ўдзячнасьць ад гэтага робіцца толькі мацнейшай.

**Андрэй Дынько**

Расея – зблізку

# Мафія ў Бэрліне

Расейскія бандыты за апошнія гады сталі неад'емнай часткай стракатае карціны бэрлінскага жыцьця. Як і прадказвалі нямецкія спэцыялісты, у Бэрліне мала што зьмянілася з часу, калі назаўсёды зьнік паўмільённы кантынгент Заходняй групы войскаў.

Іншы цікавы фэномэн: тэма «расейскай мафіі» апошнім часам амаль зьнікла з скандальна-крымінальнае кронікі бэрлінскіх газэтаў. Складаецца ўражаньне, што пасьля некалькіх нашумелых забойстваў-разборак апошніх гадоў расейскі арганізаваны злачынны сьвет у Бэрліне ўсё больш спрабуе, зразумела, наколькі гэта магчыма, крочыць поруч зь нямецкім законам. Ці прынамсі ўдаваць, што гэта так.

Бэрлінскі сэнатар унутраных справаў Ёрг Шэнбам прызнаў, што ня схільны асабліва вылучаць расейскую мафію сярод іншых арганізаваных бандаў, што дзейнічаюць у сталіцы Нямеччыны. Апроч таго, бэрлінская паліцыя ўжо назапасіла значны досьвед супрацьдзеяньня злачынным групоўкам, найперш з краінаў Усходняе Эўропы. Павялічана колькасьць паліцыянтаў на вуліцах — да аднаго службоўца ў зялёнай форме на 203 жыхары гораду. Таму Бэрлін жартоўна называюць «самай зялёнай сталіцай Эўропы». Апроч таго, рэзка палепшылася забесьпячэньне аднаведных службаў бараць-бы з бандытамі.

Расейцы дзейнічаюць у Бэрліне больш сьціпла, чым, прыкладам, віетнамцы. Былыя расейцы ўчынілі трохі болей за тузін забойстваў у пэрыяд з 1993 году. Спэцыяліст у гэтым пытаньні Увэ Шміт, адзначае надзвычайную жорсткасьць чачэнскіх наёмных забойцаў. Гэтыя «спэцыялісты», сьцьвярджае ён, карыстаюцца ў злачынным сьвеце асаблівым попытам. Таму і такса за дадзены від сэрвісу досыць высокая: таньней за 10 тыс. марак замоўнае забойства не каштуе. Усяго ж за 1995 г. крымінальная паліцыя ўзбудзіла 2139 крымінальных справаў супраць грамадзянаў з СНГ і Балтыі, якія жывуць у Бэрліне.

У адрозьненьне ад стваральнікаў фільма «Толькі па каханьні» (сьпярша яго хацелі назваць «Расейская мафія») зь нямецкай топ зоркай Кацяй Рыман, нямецкі экспэрт праблемаў арганізаванай злачыннасьці Юрген Рот, відавочна, ня думаў доўга пра назву сваёй апошняй дакумэнтальнай кнігі «Расейская мафія. Самы небясьпечны сындыкат у сьвеце». Мінімум 10 злачынных груповак з былога СССР, сьцьвярджае гэты аўтар, маюць свае апорныя пункты ў сталіцы Нямеччыны. Сярод 5 найбольш небясьпечных — «Чачэнская супольнасьць», «Джыбу», «Даўтапрудненская», «Солнцаўская» і «Пушкінская».

Больш за 1,3 млрд. даляраў перапраўілі, лічыць Ю.Рот, у Нямеччыну злачынныя групоўкі з былой савецкай імпэрыі за апошнія чатыры гады. 20 працэнтаў з гэтай гіганцкай сумы аказаліся «запаркаваныя» ў Бэрліне — паміж Курфюрстэндам і Аляксандарпляц. Няма сумневу, што вобразы новых расейскіх кілераў-мафіёзі чакаюць свае чаргі на нямецкім экране.

*Паводле матэрыялаў друку*

Каляндар

# Убачыць Ружу

Дзякуючы лібэралізацыі, якая наступіла ў Расейскай Імпэрыі пасьля рэвалюцыйных падзеяў 1905 году, у Санкт-Пецярбурзе 90 гадоў таму было заснаванае першае беларускае легальнае выдавецтва. Сталічныя інтэлігенты, якія стварылі сваю суполку на каапэратыўных асновах, назвалі яе «Загляне сонца і ў наша ваконца».

Мне шчыра хацелася б папрысутнічаць на іхніх сустрэчах, паназіраць, як дамы й джэнтэльмэны «элеганцко, двума пальцамы» трымаюць «філіжанкі з парцаляны», і мэдытуюць на тэму занядбанай беларускай вёскі. З глыбіні кавярні праз струменьчыкі дыму гаванскіх цыгараў і водбліскі галяндзкіх сьвечак пранікае незямная мэлёдыя струннага квінтэту... За вітражным вакном сьняжынкі ствараюць калейдаскапічна непаўторны воблік Зімняга... Камусьці з прысутных бракуе настрою з-за немагчымасьці аплаціць рахунак дамы, хтосьці дагэтуль не прызвычаіўся да піцерскага «прамозглага» клімату, але ці вартае ўсё гэта ўвагі, калі тут і цяпер закладаецца падмурак вялікай справы — пашырэньня асьветы сярод цёмных суайчыньнікаў?

За восем гадоў існаваньня суполка выдала 38 кніжак агульным накладам 100 тысячаў асобнікаў. Сярод іх «Беларускі каляндар, або Першая навука чытаньня» Каруся Каганца, «Першае чытаньне для дзетак беларусаў» Цёткі, першыя кнігі Янкі Купалы, Зьмітрака Бядулі, Цішкі Гартнага й інш. Ці верылі ініцыятар праекту Б.Эпімах-Шыпіла і ягоныя паплечнікі ў посьпех сваёй справы? Ці разьлічвалі яны ад пачатку, што беларуская мова ўжо ў дваццатых гадох стане дзяржаўнай? Мне падаецца, што не. Я не магу ўявіць, чым бляск і чарнота тагачаснай сталіцы Імпэрыі маглі паўплываць на людзей з унівэрсытэцкай адукацыяй, пры выбары ТАКОЙ назвы для нацыянальна-адраджэнскай арганізацыі. Сучасныя «Свабода» й «Наша Ніва» пасьпяхова працягваюць традыцыю сваіх газэтаў-прамацерак, але ніводнае сучаснае нацыянальна-асьветніцкае выдавецтва не наважылася ўзяць на сябе гонар ПРАЦЯГУ справы першага беларускага выдавецтва. «Загляне сонца і ў наша ваконца» — паспрабуйце зрабіць рэкляму прадпрыемству з такой назвай.

Задоўга да ўзьнікненьня суполкі «Загляне сонца...», задоўга да пабудовы Мікенаў і Эгіпэцкіх пірамідаў у трэцім з паловай тысячагодзьдзі да нашага часу ў Ірляндыі было створана культавае пахаваньне. Сёньня яно мае назву Нью-Грэндж і ўяўляе сабою велічэзны курган, складзены з 200.000 тонаў камянёў, засыпаных зямлёй, якія прыкрываюць тунэль і пахавальную камэру, да якой ён вядзе. У дзень зімовага сонцастаяньня сьвятло пранікае ў камэру й выхоплівае з самай далёкай сьцяны адзіны камень, упрыгожаны адмысловымі карункамі. Натуральна, што ні праз які фантастычны зьбег абставінаў гэтыя карункі не падобныя да беларускіх. Гэтак натуральна, як тое, што Нью-Грэндж ня стаўся сымбалем Ірляндзкага нацыянальнага адраджэньня.

Вядома, піцерскія рамантыкі-беларусы пачатку стагодзьдзя разумелі, што, каб сонца глядзела ў ваконца, трэба памыць шкло й зьняць чорныя акуляры. За апошнія дзевяноста гадоў мы навучыліся гэта рабіць. Але ці бачылі ў свой час першыя беларускія асьветнікі новага часу, што ружа, ператвораная ў попел, ізноў можа стаць ружай? Калі памятаеце, дзеля гэтага трэба няшмат — веры.

**Севярын Квяткоўскі**

З учора ў заўтра



*пытайцеся ў шапіках "Белдруку"*
*і ў прыватных распаўсюднікаў,*
*а яшчэ лепш – выпісвайце*

НЕЗАЛЕЖНЫ ТЫДНЁВІК
НАША НІВА
наш індэкс 63125

№ 21/96
19 — 25 жніўня

Новае слова на рынку беларускае прэсы — штотыдзень 8 палосаў патрэбнае інфармацыі

# Інфарматар
НАША НІВА

ШТОТЫДНЕВЫ ІНФАРМАЦЫЙНЫ ДАДАТАК ДА ГАЗЭТЫ НАША НІВА

ІНФАРМАЦЫЙНАЕ ЗАБЕСЬПЯЧЭНЬНЕ BELARUSIAN PUBLIC RELATIONS ASSOCIATION

БІРЖА ПРАЦЫ • КНІГІ • РЫНАК • ТРАНСПАРТ • АДПАЧЫНАК • АДУКАЦЫЯ • СПАЖЫВЕЦ • ЗДАРОЎЕ • КІНО • ТБ • ТЭЛЕСАТ • РАДЫЁ • СПОРТ • МУЗЫКА • ЗА МЯЖОЮ

## КУПОН
**Бясплатнай прыватнай абвесткі**

*Імя і прозьвішча* ____________________

*Адрэса, тэлефон* ____________________

*Тэкст:* ____________________

Запоўніце гэты купон і мы надрукуем Вашу абвестку (ня больш за 15 словаў) бясплатна.

**220123, Менск, а/с. 71** НАША НІВА






## Беларусь і сьвет
стар. 11

**Беларуска-Індзейскае Таварыства** створана 3 студзеня 1987 г., абвясьціўшы мэтай беларуска-індзейскае збліжэньне.

Галоўныя кірункі дзейнасьці БІТ: доследная праца ў галіне індзеяністыкі, гісторыі беларуска-індзейскіх сувязяў; разьвіцьцё кантактаў з індзейскімі і індзеяністскімі арганізацыямі; падтрымка індзейскага самавызначэньня, палітычны індзеянізм.

## "ЗЭКАНОМІЦЬ ПАРУ ВАТАЎ"



*Мы павінны пачынаць зь сябе і з тысячы маленькіх крокаў атрымаецца шмат вялікіх – усё болей грамадзянаў нашай краіны, не спадзеючыся болей на законы й пастановы, бяруць на сябе ініцыятыву ў барацьбе з марнаваньнем энэргіі. Кожны паасобку, лічаць яны, можа ўнесьці свой, хай нават невялікі ўклад у абарону прыродных рэсурсаў.*

Хатняя гаспадарка ўсё яшчэ належыць да ліку марнатраўцаў энэргіі ў вялікіх маштабах. Тут пральная машына працуе, загружаная бялізнай толькі напалову, многія ня могуць уявіць сабе ні дня без гарачай ванны, а каб хрумсьцелі булачкі да нядзельнага сьняданку, духоўку электрычнай пліты ўключаюць на тэмпэратуру да 200 градусаў. І так штодня адбываецца бесэнсоўнае марнаваньне каштоўнай энэргіі – бессэнсоўнае, бо гэтую энэргію ў кожным зь пералічаных выпадкаў можна было б не адзін раз зэканоміць і, натуральна, не за кошт камфорту ці пагаршэньня бытавых умоваў.

Бярыце ўдзел у гульні "Эканомім энэргію", якую Вам прапануе газэта "Наша Ніва". Рэдакцыя заклікае ўсіх чытачоў узяць удзел у гульні-кампаніі за эканомію энэргіі. Правілы гульні нагэтулькі простыя, наколькі дзейсныя: двойчы з прамежкам у два тыдні кожная сям'я, якая ўдзельнічае ў гульні, павінна зьняць сьведчаньні ўласнага лічыльніка й запісаць выкарыстаную колькасьць кіляват-гадзінаў. Гэтую працэдуру трэба пазьней паўтарыць яшчэ раз.

**Пра астатнія ўмовы гульні мы раскажам у наступным нумары "ІНФАРМАТАРА"**

Міністэрства сувязі і інфарматыкі Рэспублікі Беларусі
АБАНЭМЭНТ на газэту **63125**
НАША НІВА

Колькасьць камплектаў

На 1996 год па месяцах

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | | | | | | |

Куды ____ (паштовы індэкс) ____ (адрэса)

Каму ____ (прозьвішча, ініцыялы)

| ПВ | месца | Літэр |
|---|---|---|
| | | |

**ДАСТАЎНАЯ КАРТКА**
на газэту **63125**
НАША НІВА

| Кошт | падпіскі ______ руб. | Колькасьць камплектаў |
|---|---|---|
| | пераадрас. ______ руб. | |

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | | | | | | |

Куды ____ (паштовы індэкс) ____ (адрэса)

Каму ____ (прозьвішча, ініцыялы)

Стар. 6



## Набыцьцё аўтамабіля ў Польшчы
*Доведка "ІНФАРМАТАРА":*

Асноўныя выдаткі для грамадзяніна РБ пры набыцьці аўто ў Польшчы: кошт уласна машыны, набытай на польскім аўтарынку; кошт растаможкі; кошт пастаноўкі на ўлік.

1) Растаможка: $ 0,38 за куб. см.

Кошт растаможкі вылічваецца: колькасьць куб. см об'ёму рухавіка памнажаецца на $ 0,38.

Ад ацэначной вартасьці бярэцца 0,1% за афармленьне дакумэнтаў. Апрача таго 200 тыс. бел. рублёў за пасьведчаньне мытні.

2) Кошт пастаноўкі на ўлік: 500 тыс. бел. руб. у ДАІ за нумары і тэхпашпорт. Апрача таго 20 тыс бел. руб. за тэхагляд.




Усё большую папулярнасьць набываюць тэлевізары зь вялікім экранам і стэрэагукавой сыстэмай "Nicam". Наколькі высокая якасьць адлюстраваньня й гуку, паказалі выпрабаваньні дванаццаці мадэляў тэлевізараў з дыяганальлю экрану 59 см, што былі ажыцьцёўлены Брытанскай асацыяцыяй спажыўцоў.

**Бясплатныя прыватныя абвесткі**

**Гатунковыя глядыёлюсы**

***Гатунковыя глядыёлюсы сусьветнай сэлекцыі,***
насеньне кветак-летнікаў, агародных культураў.
Для атрыманьня каталёгаў — капэрту са знамкамі.
***ТАДОРСКІ ІВАН ФЁДАРАВІЧ***
***225653 Берасьцейская вобласьць, Лунінецкі раён, п/а Дзятлавічы***

**КВАТЭРЫ: продаж, абмен, набыцьцё**

Прадам 4-пакаёвую кватэру ў Гатаве. 48 м², 1 паверх, тэлефон, прыватызаваная. Кошт $ 17.000. Якавенка Алесь 220108, Менск, а/с 76, тэл. 277-85-28. Абмяняю 4-пакаёвую кватэру ў Гатаве – 48 м², 1 пав., тэл., прыватыз. – на 3-пак. у Менску. Без даплаты.

**ПЕРАКЛАДЫ**

**Ангельская, беларуская, польская** мовы:
*пераклады любой складанасьці, індывідуальныя заняткі.*
Тэл. 221-24-81

**ПЕРАКЛАДЫ**

**НЯМЕЦКАЯ МОВА**
пераклады
**тэл. 275-11-78.**

**ПРАЦА ДОМА**

Праца дома, са штодзённым атрыманьнем грошай,
**ад 100 тыс. руб. на дзень.**
*Капэрта з а/а + купон б/а. 220073, г. Менск, а/с 26 "РНД".*
*Тэл. 253-92-26*

**Печы й каміны**

**Майце справу з прафэсіяналамі. Тэл. 224-29-74, 232-37-54.**

# ТЭЛЕВІЗАРЫ

*Усё большую папулярнасьць набываюць тэлевізары зь вялікім экранам і стэрэагукавой сыстэмай "Nicam". Наколькі высокая якасьць адлюстраваньня й гуку, паказалі выпрабаваньні дванаццаці мадэляў тэлевізараў з дыяганальлю экрану 59 см, што былі ажыцьцёўлены Брытанскай асацыяцыяй спажыўцоў.*

**Якасьць адлюстраваньня**

Ужо перад купляй тэлевізара бальшыня людзей ведае, які памер экрану ім неабходны. Параўнальныя выпрабаваньні трох мадэляў з дыяганальлю 59 см зь іхнымі 68-сантымэтровымі аналягамі тых самых фірмаў-вытворцаў паказалі, што якасьць адлюстраваньня ў тых і ў другіх практычна аднолькавая.

Стандартны тэлевізар – якой бы добрай ні была якасьць ягонага адлюстраваньня – узнаўляе 50 кадраў за сэкунду. Некаторыя людзі гэтак адчувальныя, што ўспрымаюць гэта як раздражняльнае мігценьне экрану. А вось удасканаленая мадэль "Philips 25822A" мяняе адлюстраваньне 100 разоў за сэкунду.

Экспэрты параўналі яе са стандартным тэлевізарам фірмы Philips з тым самым памерам экрану. Асобныя людзі не маглі адчуць аніякае розьніцы датуль, пакуль ім на яе не паказалі. Тыя ж, хто яе заўважыў, сьцьвярджаюць, што выява стала значна больш якаснай.

Такім чынам, калі мігценьне экрану непакоіць Вас, верагодна, ёсьць неабходнасьць выдаткаваць болей грошай і купіць новую мадэль.

**Праблемы з шырокаэкраннымі тэлевізарамі**

У продажы зьявіліся тэлевізары з шырокім экранам. З тае прычыны, што бальшыня праграмаў трансьлюецца ў стандартным фармаце, выява на экранах такіх тэлевізараў непазьбежна дэфармуецца: кадры альбо расьцягваюцца, губляючы верхнюю й ніжнюю часткі выявы, альбо застаюцца чорныя палосы з бакоў экрану. Апошнія мадэлі шырокаэкранных тэлевізараў называюцца "PALPlus" і працуюць у новым фармаце, што забясьпечвае найлепшую на сёньня якасьць шырокаэкраннай выявы.

Была праверана адна з мадэляў тэлевізараў сыстэмы "PALPlus" – "Nokia SFN 7296" (на фотаздымку зьлева). Якасьць выявы была ацэнена як добрая, нягледзячы на тое, што падчас ажыцьцяўленьня тэсту асобныя людзі скардзіліся на мігценьне экрану. Гэтая мадэль мае таксама дэкодэр "Dolby Surround Pro Logic" з ўзмацняльнікам. Так што, падключыўшы да яе дзьве пары калёнак, можна стварыць сыстэму для паказу "хатняга кіно".

**Якасьць гучаньня**

Усе пратэставаныя мадэлі маюць сыстэму "Nicam" і лепшую якасьць гуку, чым у монапрыёмнікаў.

Яны маюць таксама асобнае рэгуляваньне высокіх і нізкіх частотаў, што дазваляе настройваць гук на Ваша жаданьне.

У тэлевізара "Toshiba 2545DB" акрамя двух дынамікаў з бакоў ёсьць два дадатковыя, разьмешчаныя зьверху. Аднак асаблівых паляпшэньняў гэтыя дынамікі не даюць: нават пры ўключэньні ўсіх чатырох якасьць гуку ў гэтага тэлевізара заставалася сярэдняй у параўнаньні зь іншымі мадэлямі тэлевізараў зь вялікімі экранамі, а пры працы толькі бакавых дынамікаў яна была й зусім кепскай.

Нягледзячы на тое, што якасьць гучаньня ў мадэляў, якія маюць сыстэму "Nicam", выключна добрая, іхныя дынамікі не адпавядаюць патрабаваньням Hi-Fi.

Вы можаце палепшыць якасьць гуку й стэрэаэфект, калі падключые свой тэлевізар да Hi-Fi стэрэасыстэмы ці да вынасных калёнак, калі для гэтага ёсьць адпаведныя гнёзды.

У ідэале калёнкі трэба разьмясьціць мэтры за два ад тэлевізара ці з абодвух бакоў ад яго. Калі Вы паставіце іх бліжэй, моцныя магніты ўнутры дынамікаў будуць скажаць выяву.

**Пульты дыстанцыйнага кіраваньня (ПДК)**

Вытворцы спрабуюць рознымі шляхамі спрасьціць рэгуляваньне тэлевэзійнага прыёмніку з дапамогай ПДК.

Так, напрыклад, клявіятура на ПДК для тэлевізара маркі "Sony-X2572U разьмешчана з абодвух бакоў пульту. На адным баку знаходзяцца ўсе наяўныя функцыянальныя кнопкі, а на другім – толькі самыя асноўныя, якімі карыстаюцца найчасьцей: пераключальнік каналаў, гук і колер.

У некаторых ПДК менш ужывальныя кнопкі схаваныя пад рухомай ці адкідной накрыўкай. З ПДК такога кшталту экспэртам найбольш спадабаўся пульт да тэлевізара маркі "Panasonic TX-25X1".

**Дапамога людзям з кепскім слыхам**

У большасьці пратэставаных тэлевізараў ёсьць гняздо для падключэньня навушнікаў, што дае магчымасьць слухаць перадачы, не турбуючы навакольных. Аднак, гэтаксама як і ў Hi-Fi сыстэмах, пры падключэньні навушнікаў гук у дынаміках адключаецца. А гэта ня вельмі зручна, калі людзі жадаюць слухаць перадачы на розным узроўні гучнасьці (калі, напрыклад, адзін зь іх кепска чуе).

Толькі ў мадэлях "Fergusson D59N", "Philips 25532" і "Sony KV-X2572U" пры падключэньні навушнікаў дынамікі не адключаюцца, а ўзроўні гучнасьці рэгулююцца незалежна адзін ад аднаго.

Калі Вы жадаеце чуць перадачу толькі праз навушнікі, то можна націснуць кнопку "mute" (выключэньне гуку) на пульце дыстанцыйнага кіраваньня.

**Наша парада**

Ва ўсіх мадэлях, якія мы Вам раім набыць, вельмі добрая якасьць выявы і, прынамсі, задавальняльная якасьць гучаньня. Тэлевізары "JVC AV-25S4EK", "Panasonic TX-25X1" і "Sharp DV-5937H" – усе працуюць добра. Іх надзейнасьць – вышэйшая за сярэднюю.

Калі Вы жадаеце набыць тэлевізар з дыяганальлю экрану вялікага памеру, то спыніце свой выбар на аналягу гэтых мадэляў з экранам 68 см: "JVC AV-28S4EK", "Panasonic TX-28X1" і "Sharp DV-6635H". У іх такая самая якасьць выявы, як і ў 59-сантымэтровых мадыфікацыяў, але крыху лепшая якасьць гучаньня.

Найлепшым з усіх мадэляў, што прайшлі праверку, прызнаны тэлевізар маркі "Philips 25822A". Аднак каштуе ён вельмі дорага, пры тым, што надзейнасьць тэлевізараў маркі "Philips" сярэдняя.

**Факты й лічбы**

Усе пратэставаныя мадэлі маюць пункт дыстанцыйнага кіраваньня (ПДК) і падстаўку пад тэлевізар. Усе яны таксама маюць сыстэму "Fastext" і, прынамсі, адзін раздым тыпу SCART. Але існуюць і іншыя характарыстыкі, істотныя для спажыўца.

**Аўтаматычная настройка**

У большасьці мадэляў пры першым уключэньні трэба ўручную надаваць нумар каналу кожнай праграме. І толькі асобныя мадэлі робяць гэта аўтаматычна.

**Запамінаньне тэксту**

Чакаць зьяўленьня на экране выбранай Вамі старонкі тэлетэксту бывае даволі стамляльна. Гэтую праблему часткова вырашае "Fastext". Ён далучае яшчэ чатыры старонкі тэксту да першапачаткова абранай. Выбар адной з далучаных старонак становіцца тады хутчэйшым. Аднак тэлевізар маркі "Sanyo" працуе марудней за іншыя, бо "запамінае" ня самі старонкі, а толькі іхныя нумары.

Большасьць мадэляў, забясьпечаных сытэмай "Fastext", мае таксама памяць для тэлетэксту, і Вы можаце захоўваць старонкі (праўда, ня болей за чатыры). Выбраныя старонкі адлюстроўваюцца на экране гэтых тэлевізараў вельмі хутка.

Найлепшыя мадэлі з сытэмай "Fastext" пазначаны ў графе табліцы "Сталая памяць для тэлетэксту". Яны захоўвалі выбраныя тэксты нават пасьля таго, як тэлевізар выключалі.

**Абарона ад дзяцей**

Толькі асобныя мадэлі тэлевізараў маюць прылады, што блякуюць электронным шляхам ці ўвесь тэлевізар – так, каб увогуле нічога ня мог паглядзець, – ці асобныя каналы. Ва ўсіх іх, акрамя "Sony", блякуецца кіраваньне толькі на корпусе самога тэлевізара, а гэта значыць, што ПДК працуе і яго трэба хаваць.

**Пазначэньне нумару каналу на экране**

Усе мадэлі ўзнаўляюць нумар каналу на экране тэлевізара на працягу некалькіх сэкундаў. Аднак тэлевізар маркі "Samsung CI-5937AN" спрацоўваў не заўжды.

**Аўдыё-/відэаўваход**

Калі Вы маеце камкодэр і жадаеце ўзнаўляць зробленыя ім запісы, выбірайце мадэль з разьмяшчэньнем гнязда для ўваходу аўдыё-/відэасыгналу на пярэдняй панэлі. Гэта шмат у чым спросьціць Вашую задачу.

**Агульныя зьвесткі**

**Функцыянальныя характарыстыкі**

1⇨ Гл. раней

2⇨Тэлевізар аўтаматычна выключаецца, калі станцыя выходзіць з эфіру.

3⇨ З уключэньнем раздымаў кшталту SCART, гнёзды для падключэньня аўдыёсыстэмаў ці іхнай камбінацыі

4⇨ Выкарыстоўваецца для падключэньня Hi-Fi сыстэмаў.

Эксплюатацыйныя характарыстыкі

5⇨ Групы экспэртаў ацэньвалі якасьць выявы й гучаньня кожнай мадэлі тэлевізара.

6⇨ Калі Вы часта пакідаеце тэлевізар у рэжыме "чаканьне", мадэль, пазначаная ☆, за год спажывае электрычнасьці на 9,50 фунтаў стэрлінгаў болей, чым мадэль, пазначаная ●.

**Выніковая ацэнка**

Гэтая ацэнка, якая надаецца паводле дзесяцібальнай сыстэмы, улічвае вынікі ўсіх тэстаў. Яна ня ўлічвае кошт, але надае пільную ўвагу найбольш істотным характарыстыкам тэлевізараў, а менавіта:

якасьць выявы — 35%

якасьць гучаньня — 21%

карысныя функцыянальныя характарыстыкі — 15%

**Пазначэньні:**

★ найлепшыя вынікі

☆

○

● найгоршыя вынікі

## Тэлевізары з дыяганальлю экрану 59 см



| | | Fergusson D59N | Hitachi C2546TN | JVC AV-25S4EK | Mitsubisi CT-25A5STX | Panasonic TX 25X1 | Philips 25X1 | Philips 25832B | Samsung CI-5937AN | Sanyo CB5948 | Sharp DV-5937H | Sony KV-2572U | Toshiba 2545DB |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **Спэцыфікацыі** | | | | | | | | | | | | | |
| Краіна-вытворца | | Нямеччына | Ангельшчына | Ангельшчына | Ангельшчына | Ангельшчына | Францыя | Бэльгія | Ангельшчына | Ангельшчына | Гішпанія | Ангельшчына | Ангельшчына |
| Шырыня х вышыня х глыбіня (см) | | 62x48x45 | 70x52x47 | 60x50x45 | 57x50x43 | 63x50x47 | 69x49x47 | 67x50x49 | 71x53x50 | 68x53x45 | 69x54x43 | 59x49x51 | 67x53x44 |
| **Функцыянальныя характарыстыкі** | | | | | | | | | | | | | |
| Аўтаматычная настройка | 1⇨ | | | | | | | | | | ёсьць | ёсьць | |
| Пазначэньне каналу на экране | 1⇨ | ёсьць | ёсьць | ёсьць | ёсьць | ёсьць | ёсьць | ёсьць | ёсьць[1] | ёсьць[1] | ёсьць | ёсьць | ёсьць |
| Сталая памяць для тэлетэксту | 1⇨ | | | | | | | | | | | | |
| Аўтаматычнае выключэньне | 2⇨ | ёсьць | | | ёсьць | ёсьць | | гл. 1 | ёсьць | | ёсьць | ёсьць | ёсьць |
| Таймэр для выключэньня | | ёсьць | ёсьць[1] | ёсьць | ёсьць | ёсьць | ёсьць | ёсьць | ёсьць | ёсьць | ёсьць | ёсьць | ёсьць |
| Таймэр для ўключэньня | | | | | | | | | | | | | |
| Абарончае блякаваньне ад дзяцей | 1⇨ | ёсьць | | ёсьць[1] | | | ёсьць | ёсьць | | | | ёсьць[1] | |
| Колькасьць аўдыё-/відэаўваходаў | 3⇨ | 2 | 3 | 3 | 2 | 3 | 2 | 3 | 3[2] | 1 | 3 | 3 | 3 |
| Аўдыё-/відэаўваход на пярэдняй панэлі | 1⇨ | ёсьць | ёсьць | ёсьць | ёсьць | ёсьць | ёсьць | ёсьць | ёсьць | ёсьць | ёсьць | | |
| Аўдыёвыхад для стэрэасыгналу | 4⇨ | ёсьць | ёсьць | ёсьць | ёсьць | | | | | | | | |
| Выхад для вынасных калёнак | | ёсьць | ёсьць | ёсьць | | | | | | | | | |
| Гняздо для падключэньня навушнікаў | | ёсьць[1] | ёсьць | ёсьць | ёсьць | ёсьць | ёсьць | ёсьць | ёсьць | ёсьць[2] | | | |
| **Экплюатацыйныя характарыстыкі** | | | | | | | | | | | | | |
| Якасьць выявы | 5⇨ | ☆ | ☆ | ★ | ○ | ★ | ☆ | ★ | ○ | ★ | ★ | ★ | ★ |
| Якасьць гучаньня | 5⇨ | ● | ○ | ○ | ● | ○ | ○ | ★ | ○ | ● | ☆ | ● | ○ |
| Прастата настройкі і інструкцыі да эксплюатацыі | | ● | ☆ | ○ | ☆ | ○ | ○ | ● | ● | ● | ☆ | ☆ | ☆ |
| Зручнасьць карыстаньня | | ○ | ○ | ○ | ● | ☆ | ○ | ☆ | ○ | ● | ○ | ○ | ○ |
| Спажываньне энэргіі ў рэжыме "чаканьне" | 6⇨ | ○ | ○ | ○ | ○ | ○ | ○ | ○ | ● | ☆ | ● | ☆ | ○ |
| **Выніковая ацэнка** | | **6** | **7** | **8** | **6** | **8** | **7** | **9** | **6** | **6** | **8** | **8** | **8** |
| **Інфармацыя** | | | | | | | | | | | | | |
| Дадатковыя заўвагі/ Зьмены з часу ажыцьцяўленьня тэсту | | 1) Ёсьць незалежнае рэгуляваньне гучнасьці | 1) Ёсьць спэцыяльны таймэр | 1) Толькі выбраныя каналы | | Ёсьць калькулятар/каляндар з вывадам на экран | 1) Ёсьць рэгуляваньне гучнасьці | Выяўленьне ў лічбавым выглядзе, эфэкты, частата кадраў – 100 Гц, шматстаронкавая памяць | 1)Ненадзейнае 2) Плюс адкрыты ўваход для S-VHS | 1) Толькі выбраныя каналы 2) Ёсьць незалежнае рэгуляваньне гучнасьці | | Не захоўвае ў памяці стар. "Fastext" 1) Толькі нумар, дадзены загадзя | Сыстэма з 4-х дынамікаў. Максымальны ўзровень гучнасьці заніжаны |

Ганна Матусэвіч

# Дзёньнік без канца

5.08. Душа, што аголены электрычны провад — лепш не дакранацца.

6.08. Дзеці пытаюцца, хто такі «пілігрым». У нашым родзе была некалі незамужняя дзяўчына Зоня Суднічанка — цётка майго бацькі па мячу, паводле Арлова. Яшчэ й цяпер пра яе расказваюць нейк паблажліва, хоць яна, відаць, была моцнай натурай. Ейная постаць абрасла недарэчнымі мітамі, і я раблю выснову, што Зоня мела своеасаблівы талент і гэтым вылучалася зь сялянскага асяродзьдзя, якое яе не прымала. Ну, напрыклад, кажуць, што яна зьядала 25 бульбін зараз. Ці мала што на сьвеце бывае... Зоня была надта набожная і ўсё хадзіла па касьцёлах, а перад вайной і зусім засталася служыць у плябані пры Койданаўскім касьцёле. У вайну яна аднак вярнулася ў сваю вёску Камароўшчына, дзе неўзабаве й памерла ад моцнае прастуды.

Дык вось Зоня хадзіла разам з другімі жанчынамі да касьцёлу аж у самую Вільню. Пешшу хадзіла, начавала ў знаёмых. Толькі пілігрымам яе ніхто не называў, а ейны родны бацька ахрысьціў яе «лайдачкай».

7.08. Ну й чаго я дабівалася*, баронячы чалавечыя правы перад каменнай сыстэмай? З канторы СГП-42 пайшлі неблагія людзі: Сімакова Я.М. ды Лобач В.А. Засталіся самыя-самыя. Але добра, што хоць дзьве душы прачнуліся. Кропля й камень крышыць.

Што ні робіцца — усё да лепшага. Пазьняк, як ніхто з нас, нясе цяжкі крыж, хоць ён, памятаю, і пратэставаў супраць слова «крыж». І вось цяпер, калі зло згвалціла нашую бедную зямельку, Бог абараніў гэтага дужага чалавека ад нападу зла.

8.08 ... але добра ўжо й тое, што зь людзей асыпаецца шалупіньне ілжывай набожнасьці.

9.08. Чаму гімн абавязкова павінен быць са словамі? Няхай гучыць музыка, і кожны хай разумее яе па-свойму. Нашто навязваць людзям чужыя думкі? І наогул, хіба можна абняць неабдымнае і выказаць словамі ўвесь бясконцы Космас? І такой музыкай мог бы стаць Палянэз Агінскага.

10-11.08. Расказвалі мне, што Ўладзімер Гілярaвіч, той, што Гаркун і той самы, што падвозіў некалі майго бацьку на матацыкле ў бытнасьць старшынём нашага калгасу «Чырвоны Сьцяг», адшукаваў сваю 50-ку ў Койдынаўскім «Каласку». Ведама, Менску хоць бы тузам дагадзіць. А падтузьнікаў адпускаюць, як і ў часы Івана Жахлівага, на кармленьне ў народзе, зь якога яны й выйшлі. Кажуць, стольки ўжо пыхлівых гасьцей пазьбіралася, што змусілі местачковую міліцыю прыцягнуць да аховы іхніх картэжаў.

Вось і Камушэнка П.Н., начальнік СГП-42, каб надта не адставаць ад савецкіх традыцыяў у сьвяточны дзень будаўніка («быў дзень сьвяты» — ня блытаць!) кінуў па абсмактанай костцы сваім чорным працаўнікам. А чэрнь і радая, што яе абалваньваюць. І хоць «празнавалі» (мушу ўзяць на сябе сьмеласьць увесьці наватвор, бо яны менавіта «празнавалі», а не сьвяткавалі) не з такім бляскам, як Гілярaвіч, але напіліся багата. Аб гэтым засьведчаць і гара бутэлек, і рэшткі закусі, і куча сьмецьця, і асабліва ярка-чырвоная юшка, што шчодра разьліта па лесьвічнай клетцы.

І толькі мне адной горка ўсьведамляць, што мужчына зьяўляецца табе сябрам да першага ж павароту, дзе блісьне чарка, у прывідным сьвятле якой ён забудзецца на ўсё.

13.08. Міколка еў хлеб у нашай спальні на сене. А ўначы, пачуўшы сытны дух, прыходзілі да нас мышы. Прыходзілі не як госьці, не як жабракі, не як малодшыя браты і не як суседзі, хоць мы й жывем разам на адной зямлі.

Мышы зрабілі дзёрзкі налёт, як партызаны, як часам мы, беларусы, калі асьмелімся вылезьці з-пад веніка. Мыш ускочыла мужу на руку, пасьля прайшлася па маёй галаве. Было болей гідка, чым страшна. Няўжо й да нас так ставяцца?

14.08. Я сёньня ўстала ранараненька. Яшчэ ня выкаціўся вогненны шар жыцьця, але чырвань скрозь была разьліта на ўсходзе, і на прасьветленай зямлі ўжо прадчувалася радасьць Быцьця.

15.08. Можа й зашмат мы песьцім сваіх спадчыньнікаў — тыя вырастаюць раздурамі.

Мяне сёньня падвёў сьляпы мацярынскі інстынкт, хоць я ўжо й выйшла з узросту маладых мамаўквахтух. Нейкія жалосныя гукі разносіліся на двары, а мне прымроілася, што гэта Міколка скінуўся зь сена і галосіць-кліча на дапамогу. Лётам кінулася ў гумно — Міколка салодка спаў, а на суседнім панадворку бляялі дзьве маладзенькія козачкі.

16.08. Выбілася са сну і, апанаваная цяжкімі думкамі, усю ноч, як паратунку, чакала раніцы.

І нарэшце яна наступіла: шэрая, непрыветная, захмараная. Але ў гэтую раніцу я, як ніколі, мела асаблівую ўдзячнасьць да пеўня.

17.08. Цікавы чалавек — мой сусед! Ніколі ня бачыла, каб ён сядзеў склаўшы рукі. (Апроч не такіх ўжо й рэдкіх выпадкаў «бягучых гасьцей», як кажа мая мама.) Ён пешшу й хадзіць ня ўмее. Ці на машыне, ці на ровары езьдзіць, а на сваіх дваіх —толькі лётае. А бывае ўшчухарыцца ні сьвет, ні зара ды блукае злосны, што мядзьведзь-шатун. І толькі бурчыць сабе пад нос: «Што гэта мне рабіць?» Ніяк ня можа сплянаваць, за што яму ўзяцца, хоць работы процьма.

А цяпер і я да яго ўпадобілася. Нешта мне недалягае. Можа гэта лёс скіроўвае мяне на нейкі новы паварот?

18.08. Ну чаго я гэтак усхадзілася? Лета на дварэ. Конікі трашчаць у траве, дрэвы, птушкі... і я ЁСЬЦЬ на Зямлі. Няўжо мне гэтага мала?

19.08. Мала! Вось сёньня зь дзецьмі прынесьлі зь лесу кош грыбоў ды вядро ягадаў. А калі падзяліць на ўсіх — то будзе зусім нічога. І я, на жаль, не Хрыстос, каб накарміць усіх галодных...

** Гісторыя змаганьня аўтаркі з кіраўніцтвам СГП-42 распавядалася ў ранейшых нумарах «НН» (Заўвага рэдакцыі).*

Аўген Касьцюшка

# Вясельле

27 ліпеня 1996 г. ажаніўся мой родны брат.

Набыты кветкі, даведзены апошнія справы, машына пад'яжджае да дому нявесты. Шмат народу, машын, сваякі хвалююцца, чужыя цікаўна пaглядаюць, гуляюцца купкамі дзеці. Трэба з усімі вітацца, супешваць сваякоў, падбадзёрваць іншых, замацоўваць стужкі колеру італьянскага сьцягу на капоты. Пасьля паласы пахмурнага надвор'я на дзіва шчодра сьвеціць-паліць сонца.

Сабраліся, першая перашкода — выкуп пажылай суседцы за ўваход у пад'езд. Бабка спрытная на язык, разьбіраецца у такіх штучках. Але галоўны выкуп — у самой кватэры. Хоць торг ідзе весела, бойка, адчуваецца нэрвовае напружаньне, бо час падціскае, таму я на эмацыйнай хвалі даю дружцы нявесты буйную купюру, бо «шчасьце брата мне даражэй за грошы», і вось жаніх абдымае нявесту, і па машынах, у ЗАГС.

За чвэрць гадзіны праяжджаем 12 км да месца. Уваходзім у Палац шлюбаў, аздабленьне даволі прыгожае, чыста, утульна, сустракаюць ветлівыя кабеты, запрашаюць у рытуальную залю. Тут яшчэ лепш, кабета-служка вясельнага абраду пачынае казаць пастаўленым голасам выпрацаваныя правільныя словы, фальшу ў голасе няма, тон, міміка, жэсты спакойныя і дарэчныя.

Два прыкрыя для мяне моманты: казала па-расейску і над трыбунай вісеў герб «капуста». Праўда, у думках я разьвесяліўся, бо зь сябрамі жартавалі, што герб Лукашэнкі —клясная ілюстрацыя лёзунгу «Беларусь па-над усім!», там абрыс краіны ў сонечных промнях над ўсёй плянэтай.

Станоўчыя адказы пра згоду на шлюб, урачыстае падпісаньне, абмен пярсьцёнкамі, першы сужэнскі пацалунак пад воклічы «Горка!», віншаваньні і дарэньне кветак маладым. Пасьля праходзім у банкетную залю, расьпіваем шампанскае з цукеркамі, напружаньне пацiху спадае, жарты, сьмех.

Мы былі ў ЗАГСе менш 30 хвілін, далей вясельны картэж на чале з «Кадылякам» маладых крануўся ў падарожжа па горадзе. «Вечны агонь», ускладаем кветкі, далей. Па дарозе ў той дзень сустрэлі з 15 вясельных паяздоў, шлюбная сяўба на Дзень Незалежнасьці. На ўскрайку гораду ў бярозавым гаі танцы з шампанскім пад украінскія вясельныя песьні (я сам іх паставіў, бо беларускіх не знайшоў). Хораша, сонейка, добрае паветра, высокія стройныя бярозы, прыгожыя вясёлыя людзі. Вясельле, пачынаючы ад выкупу, запісваецца на відэакамэру. Едзем у замоўлены рэстаран у другі канец за 30 км па трох мастох (для трывалага шчасьця), спыняемся ля Кургану Славы, дзе спрытны паслужлівы фатограф шчоўкае 8 кадраў, назаўтра ў 7 раніцы, як і абяцаў, прыносіць дахаты па 3 фоткі на кадар і зарабляе 300 тысячаў. Малойца мужык, круцішца, людзям карысьць і сябе ня крыўдзіць.

Ля ўваходу ў рэстаран бацькі (яны ў ЗАГС ня езьдзілі, такі звычай) маладых сустракаюць з караваем і келіхамі. Бацькі кажуць традыцыйныя словы пра заможнае жыцьцё і закаханыя сэрцы, пара навыперадкі п'е з келіхаў, весела б'е іх на шчасьце, ротам кусаюць каравай, хто болей. Жаніх, натуральна.

Дабраліся такі да піра. Заля шыкоўная, стол багаты, з густам афармлены, ажыўлены гул. Тамада спрактыкаваны, займальна вядзе бяседу, кіруе застольлем. Паводле ерархіі, бацькі жаніха, нявесты, пасьля родзічы кажуць тосты-зычэньні маладым. Слухалі ўсе ўважліва, зь цікаўнасьцю, «Го-орка!» не змаўкала. Сама пара, усе пагадзіліся, выглядала гарманічна, «красіва, як у кіно», удалы саюз. Я казаў тост-зычэньне сёмы, адзіны, хто чыста па-беларуску. Мой тост прызналі за лепшы. Далей музыка, танцы, гульня ў тэсты для маладых, падобныя да перадачы «Каханьне зь першага погляду», нязмушанае застольле, гутаркі ў кампаніях, багата сьмешных здарэньняў. Накшталт, як я папярэдзіў старэйшую з афіцыянтак пра шкоднасьць для іхняга здароўя красьці ў вялікіх памерах зь вясельнага стала. Спаць разьехаліся глыбока ўначы.

Другі дзень правілі вузейшым колам, было вальней, болей сяброўская атмасфэра. Агульны кошт такога ладнага вясельля склаў пад 25 млн. БРБ, маладым падарылі трохі больш. Гэта сацыяльныя штрыхі.

Асобна адзначу істотныя зьявы. На шматлюдным вясельлі ў большым паўмільённым месьце фактычна толькі я казаў на беларускай мове, і ўсе нармальна ўспрымалі, нават самі міжволі па-беларуску гутарылі. У другі дзень у мужчынскай кампаніі зайшла гаворка пра мову. Пачаў яе брат бацькі нявесты, 60-ці гадоў, з таго, што хоча паціснуць мне руку за чысьцюткую свабодную беларускую мову, я зь ім і пазнаёміўся на вясельлі. Сваю пазыцыю ён сфармуляваў так: ёсьць сувэрэнная краіна, павінна быць і свая мова. Слушна кажа чалавек, які пражыў больш за паўстагодзьдзя ў СССР, а зь ім пагадзіўся ягоны брат, бацька нявесты, палкоўнік СА на пэнсіі з 30-гадовым тэрмінам службы ў «крэпасьці савецкага інтэрнацыяналізму», і ён нармальна ўспрымае самастойную Беларусь. Быў засумняваўся, як быць з тэхнічнай і навуковай тэрміналёгіяй. Я правёў паралель са становішчам расейскай мовы ў канцы XVIII — пач. XIX ст., калі мовамі навукі і тэхнікі, вышэйшага сьвету лічыліся нямецкая і француская, а расейская — «дзеравенскай», ён зразумеў. Разумныя людзі ўспрымаюць абгрунтаваныя доказы.

Увечары таго ж дня, ужо на кватэры сьведкі жаніха падобная гутарка ўзьнікла на кухні за пляшкаю. Маладыя самастойныя хлопцы, адзін працуе дантыстам, другі сканчае інстытут, трэці ўжо навасьпечаны інжынэр, чацьверты — рабочы, сямейны, і ўсе яны ўспрынялі мой патрыятызм, маю беларушчыну. Была добрая размова, было пачуцьцё еднасьці сыноў адной краіны, а ўсе яны хлопцы сучасныя, крутаватага пакрою. І тым ня менш, калі сустрэлі ў маім вобліку сучасную маладую беларушчыну, яна іх прыцягнула, закранула струны ў душы. Такі штрых: адзін зь іх, моцны хлопец, прапанаваў мне падужацца на руках, я тройчы перамог яго. Згадваю не для пахвальбы, а таму, што беларушчына мусіць мець дужыя рукі і разумныя галовы. Пазьней мне перадалі, што трое маіх знаёмых зь вясельля размаўлялі пабеларуску. Ясна, што там быў элемэнт гульні, але... Пазьней у сьведкі мы прагледзелі трохгадзінавы відэазапіс вясельля. Дакумэнтальна-камэдыйны фільм, цікавейшы за галівудзкія.

Андранік Антанян

# Малітвы нямых

У нядзелю пад вечар скончыліся цыгарэты. Начныя крамы й шапікі ў мяне на раёне ня водзяцца. Бабці, што ратуюць насельніцтва ад нікатынавага галаданьня, ужо згарнулі сваю дзейнасьць. Мне не застаецца нічога іншага, як ехаць у цэнтар.

Зайшоў у тралейбус. Заплаціў кандуктару за праезд. Еду — у вакно гляджу. Урбаністычныя краявіды Магілёва апошнія дваццаць гадоў не зьмяняюцца ні ў які бок. Нават чырвоныя шчыты каля мясакамбінату засталіся. Толькі сёньня развучыліся згадваць пра XXVI зьезд КПСС. Пішуць пра тое, што «В согласии и единстве — сила нашего народа». Лёзунг, як і ўсе рэклямныя лёзунгі, — ананімны.

На Пушкінскім праспэкце нехта рэзка піхнуў мяне ў плячо. Нейкі мужык гадоў трыццаці, падстрыжаны нагала, падсоўвае мне пад нос кардонку, на якой друкаванымі літарамі ад рукі напісаны тэкст, які пачынаецца словамі: «Я глухі...» Мужык жэстамі заклікае мяне прачытаць усю ягоную пісаніну. Але я й так здагадаўся, што ён цыганіць грошы. Тэкст быў напісаны без памылак, а жэстыкуляваў ён вельмі неахайна й хаатычна. Я адмоўна матлянуў галавою, і ён пайшоў далей. Ён усяляк намагаўся паказаць сваю ўсхваляванасьць, аднак звычайныя глухія ў такім стане, не кантралюючы сябе, выдаюць у эфір жахлівыя няўцямныя гукі. Гэты ж маўчаў, не раўнуючы як той селядзец. Так сталася, што выйшлі мы зь ім на адным прыпынку ды разыйшліся ў розныя бакі.

Праз паўгадзіны, калі ў маёй кішэні ўжо ляжаў пачок «LM», я зноў на прыпынку чакаў тралейбуса, які завязе мяне ў найпаскуднейшы раён г. Магілёва — Кірава. На прыпынку стаяў той самы мужык, што нэндзіў у тралейбусе. Стаяў ён пад ліхтаром разам зь вельмі высокай і на дзіва прыгожай кабетай і трымаў у руках дзіцёнка. Кабета «пальцамі» выказвала меркаваньне, што ўжо вельмі позна, і тралейбусаў, відаць, болей ня будзе, а пасьля пачала распавядаць, якім чынам церла дзень. Во як. Глухія муж і жонка пад ліхтарным слупом на плошчы Арджанікідзэ гамоняць пра піражкі-тваражкі.

Тралейбус прыйшоў неўзабаве. Глухі з гладка выгаленым чэрапам перадаў сына на рукі жонцы, дастаў з унутранай кішэні зацёртага пінжака сваю кардонку й пайшоў па салёне. Мяне ён абыйшоў увагаю. Людзей ехала шмат, але яму відавочна не шанцавала. Адна кабета папрасіла яго паказаць дзіцёнка. Ён вярнуўся да жонкі й забраў у яе з рук заспанага хлопчыка. Хлопчык пачаў хныкаць. Грошай, праўда, ніхто так і ня даў. Кандуктарка глядзела яму ў сьпіну з грэблівай усьмешкай на ярка нафарбаваных вуснах.

Каля мяне вызвалілася месца. Мужык пасадзіў дзіцёнка каля мяне. Я дастаў з кішэні пару пакамечаных тысяч і аддаў іх Глухому. Падзяка была вельмі эмацыйнай. Раптам тралейбус рэзка спыніўся, «рогі» зьляцелі. Глухі стаў тлумачыць сыну, што ў гэтым тралейбусе едуць дрэнныя людзі, што ён маліўся да Бога, каб Ён яму дапамог, і вось вынік. Праз хвіліну ў салёне пагасла сьвятло. Абарваліся драты.

Дахаты давялося вяртацца пешкам. Я крочыў па абсалютна мёртвым праспэкце й думаў, няўжо сапраўды Бог такі чуйны да малітваў нямых?

Наталка

Апавяданьне

# Калі прарэзваюцца

Ледзьве стрываўшы, каб не застагнаць, я адарвала галаву ад падушкі, села на ложку і сама сабе жахнулася: жаданьне зараз жа скончыць гэтае паскуднае жыцьцё дамінавала над усімі астатнімі. Пакуль я курчылася над ракавінай, пакуль, трымаючыся за галаву, грэбалася ў скрыні зь лекамі, пакуль мяне, як хацела, трэсла ліхаманка, жаданьне ператварылася ў цьвёрды намер. Са скамечанай насоўкай у адной руцэ і жменяй таблетак у другой, гаротная, дашчэнту прастуджаная, я напрасткі шыбавала да той мяжы, дзе няма ні памежнікаў, ні парушальнікаў і, па чутках, толькі адзін мытнік. Тымчасам выразны радыёголас зь вялікім задавальненьнем паведаміў, што «ноччу да мінус дзесяці». І напрамак маіх думак рэзка зьмяніўся. Я не магла пакінуць без апекі свае артышокі. Сорт «Дон Анунцыё Сісаль» — гэта такі абсалют, што перад ім адступае нават горыч апошніх хвілін. Але ён зусім не пераносіць раптоўнага пахаладаньня. Мяжа, што была ўжо блізка, зноў адплыла да далягляду. Я выправілася ратаваць абсалют.

На прыпынку супраць Камароўкі было на дзіва мала народу: некалькі чырванатварых цётак, зграйка летуценьніц са скрыпкамі ў футаралах, тып у плашчы з паднятым каўняром (прыцягнуў, багема, гіпсавага каня зь сябе ростам і ўсталяваў на лавачцы) ды зух — мэтар з кепкай на высокіх абцасах. Я, жэрдка ў паліто амаль аднаго з сабой веку, у бурках «бывай, маладосьць» і шэрай хустцы, прыкрываючы твар ад ветру высакапробным скепсісам трыццацігадовай незамужняй жанчыны, стала воддаль.

Каб зразумець, што бацькі гораду па завядзёнцы пусьцілі патрэбны мне аўтобус па іншым маршруце, я мусіла ў костку зьмерзнуць. Нячысты, і ніхто другі, пад'юдзіў мяне перайсці на суседні прыпынак дарогай праз двары. Кінуўшы разьвітальны позірк уздоўж вуліцы, я шмыганула ў арку змрочнага хмарачоса і... аслупянела. Божухны, гэта ж ня Менск! Вільня, Прага, Пітэр Брэйгель-старэйшы! З-пад ног уніз — стромкі горны адхон, і дамкі, дамкі, дамкі... Падмурак аднаго лепіцца да даху другога, каменныя агароджы, стогадовыя дрэвы, сумёты ды на паўнеба палае халодным агнём чысты захад. Я працёрла вочы. Які захад, не гаворачы пра пэйзаж? Я ж выйшла з дому ў дзевяць гадзін раніцы, і зь неба сеялася імжа... Ды і скуль бы такая панарама ў раўнінным і ўраўнаважаным горадзе?



Уніз вілася сьцежка, ці то, лепш сказаць, раскатаная дзецьмі коўзанка. Рыпнуў сьнег, і побач са мною апынуўся той самы зух на абцасах, што таміўся на прыпынку.

— Ну што, — кажа, — паненка, — я вылупіла вочы, —праедземся зь ветрыкам?

Вусы ў нітачку, нос — а-ля шляхта засьцянкова, а ўжо абцасы, абцасы!

— Праедземся, — адказваю, адшукаўшы, нарэшце, голас, — чаму не? Стартуй першы, лавіць бэндзеш, кавалер!

Кавалер блісьнуў зубамі, шматзначна падмігнуў (о, халера, праводзіць да вакзала, самае меншае!), страпянуўся, схамянуўся, пашыбаваў да коўзанкі і раптам трах! бах! —спатыкнуўся, грымнуўся ды, замест таго каб плаўненька скапіцца па коўзанцы, бліскавіцай зьляцеў па амаль адвесным адхоне, ліха скочыў з падгопу і прызямліўся роўненька на вострую жалезную агароджу. Галава па адзін бок, ногі — па другі. І стогне. Няголасна, але пранікнёна. Нешта накшталт «вой-вой-вой» з пэрыядычнасьцю сыгналаў дакладнага часу.

Села я, прабачце, на паліто і асьцярожна, каб, крый Божа, не зваліцца сьледам за зухам, пасунулася ўніз. Коўзанка, раз-другі лягла ў віраж і выкінула мяне на пустынную вуліцу. Ускочыўшы на ногі, я кінулася на стогны і прырасла да сьнегу.

Насустрач мне шпацыравалі пяцёра. Морды — не для апісаньня. Што ж, думаю, торбы сваёй я ім усё адно не аддам. Прыцiснула яе да, зноў жа выбачайце, грудзей і, утаропіўшыся ў зямлю, панеслася наперад. Натуральна, упёрлася рыхтык у самую морду. Я ўправа — яшчэ адна, такая самая. Я ўлева — а там другая, шмат горшая. Стаю. А яны задумлівым паўколам адцясьняюць мяне да высокага, пад два мэтры, муру. Адцясьнілі. Разглядаюць.

— А ну, — лагодна кажа адзін, — прадэманструйце, галуба, што ў вас у торбачцы? — і ў сваю чаргу рухам добрай волі дэманструе мне нож.

— Сьцеражы-ы-ся!! — раўнуў зь нябёс трубны голас. — Кідаю!



Бандыты сыпанулі ў розныя бакі. Я ледзьве пасьпела адскочыць, як гіпсавы конь грымнуўся аб зямлю і разьляцеўся на дробныя кавалкі. За шэдэўрам скульптурнага мастацтва з плоту саскочыў яго ўладальнік — багема з паднятым каўняром.

Пакуль я выбіралася з сумёту, куды трапіла, ратуючыся ад скакуна, бандыты ўжо абкружылі прыбылага. Але той не сумеўся, каго — праз галаву, каго — аб калена, і вось перад ім толькі двое. Што праўда, з нажамі. І цiснуць яго да плоту, як перад хвілінай мяне. Ну, мяркую сабе, надышла пара ўсё ж такі прадэманстраваць, што ў торбе. Не марнатрацячы часу, падляцела ды прыгаломшыла абодвух малатком. Зьбіраючыся на дачу да артышокаў, я, бачыце, прыхапіла тое-сёе з інструмэнтаў, каб адчыніць, калі што, навалоглыя дзьверы.

Бамбізы з нажамі маляўніча працягнуліся ля маіх бурак. Чорная кроў лілася ў Свіслач. Хтосьці крануў мяне за плячо, я адрухова павярнулася і, зьбітая з ног страшэнным хукам, праляцела добрыя тры мэтры ды спаўзла па сьценцы: гэта мяне прывітаў адзін з тых, каго багема з самага пачатку паклаў у снег. Праз хвілю бандыт ізноў апынуўся ў сьнезе й заціх. Багема памог мне ўзьняцца. Вочы мае засьціў крывавы дым, у вушах гуло нешта сярэдняе паміж прыбоем і канцэртам Вагнэра.

— Там! — шапчу, напаўтрызьнячы. — Зух на плоце, «хуткую дапамогу»!

Я паматала галавой і трохі ачуняла. І што ж пабачыла, калі ружовы туман збольшага расьсеяўся? Зух, які, як я думала, аддаваў канцы на вострых жалезных прутах агароджы, цэлы і здаровы, расьцьвітаючы чароўнай усьмешкай, дэфілюе цераз вуліцу, разьвітальна робіць ручкай і зьнікае за рогам!

Налётчыкі ў сьнезе заварушыліся.

— Ведаеце што, — далікатна зьвярнуўся да мяне багема. — Калі вы зможаце, то нам лепш адсюль уцячы.

Адзін з бандытаў узьняўся на кукішкі.

Як мы беглі! Сьвісьцеў-гуў у вушах вецер, адляталі назад камяніцы і ліхтары, палаў захад... Раптам вуліца рэзка павярнула, і раззлаваны трамвай, пад колы якога мы ледзь ня трапілі, вылаяўся званком. Я ашалела азірнулася. «Хлеб, малако», «Белая вежа», людзі, аўтобусы і ніякіх прыкметаў Брэйгеля-старэйшага.

— Скончылася! — узрадавалася я. — Уфф!

— Прапаную па кілішку каньяку, — хуценька адазваўся мой выратавальнік. — «На ростанях». Заслужылі. І, дарэчы, дазвольце назваць сябе, — пратарахцеў чарговы трамвай, і імя я не пачула. — Паводле роду заняткаў — скульптар.

Швэйцар «На ростанях», пабачыўшы нас, адхіснуўся ад дзьвярэй, а шатніца, прымаючы паліто, зьбялела з твару. Люстэрка засьведчыла, што гэта цалкам мая заслуга. Скульптар выглядаў зусім нядрэнна, невялікія драпкі нават рабілі яго няправільныя, але прывабныя рысы больш выразнымі. А вось што да мяне... Перапэцканыя нейкім мазутам

Віктар Шніп

## У імгле



Адракліся ад сьвят і сьвятла
і наш дом затапіла імгла,
у якой, як пачвары, на дне
мы варожым на чорным віне,
і гаворым, што дрэнна жывем
і свой дом адурэла клянём.
І нам хочацца сьвят і сьвятла,
і нам мроіцца храмы са шкла,
у якіх нам ніколі ня быць,
бо нам храмы са шкла – разбурыць...
І сядзім мы ў праклятай імгле,
і танцуюць чарты на стале.

***

Ліхтары па вуліцах блукаюць
і ў цямнечы восеньскай шукаюць
дзён мінулых сумнае цяпло.

Дзяўгаюць збрыдлівыя сабакі,
у сьмяцьці шукаючы прысмакі,
марачы пра сучак і жытло.

Алькагольцы лаюцца да ранку,
зноў частуе бізнэсмэн каханку
і яна, як д'ябліца, раве.

І ніхто нікога не хвалюе,
толькі поўня Млечны шлях цалуе,
па якім да Бога чорны крыж плыве.

***

Я хадзіў па бязьлюдным праспэкце
і ў вітрыны-калюгі глядзеў.
І зіму я знаходзіў у леце,
і зімы, як турмы, не хацеў.

Я хадзіў, як вашывы сабака,
мне ад суму хацелася выць,
піць віно і, сьпяваючы, плакаць,
ненавідзець усіх і любіць...

І я выйшаў на людным праспэкце
з той начы, дзе свой дзень я збудзіў,
бо нікога, як Вас, ва ўсім сьвеце
ненавідзіў я так, ні любіў.

***

Я быў туняядцам,
як вецер, які ня ведае дзе яго дом,
але які ведае, што тут яго Радзіма...
Я быў туняядцам,
які хадзіў па горадзе з торбай,
у якой, як птушкі ў гнязьдзе, былі
вершы,
вершы, як дазвол на права жыць
у гэтым горадзе.
І піў я зь сябрамі віно
і сумна было мне,
і неба было, як прорва,
куды мы ляцелі, як цыгарэтны попел.
І неба было, як ратунак
ад гэтай зямлі,
на якой я быў туняядцам.

# Шатляндзкая спадніца

Англія заўсёды была для беларусаў прывабнай краінай. Пра гэта сьведчаць, напрыклад, «Дзёньнікі» Тодара Білевіча, вядомага ў свой час навукоўца-філёзафа і вялікага аматара падарожжаў, які наведаў Англію ў канцы 70-х гадоў XVI ст. Ён зазначае, што «ангельскі край вельмі багаты... і прыгожы з выгляду. Тут шмат палацаў, прыгожых на вясковы лад..., звычаі і лад жыцьця вельмі падобныя да нямецкіх. Звычайна п'юць піва, і вельмі добрае. У гэтым каралеўстве ўжо няма ніводнага каталіцкага касьцёла,... толькі адна каплічка ў каралеўскім палацы для самой каралевы, якая каталічка, бо родам партугалка... Лёндра (Лёндан)... нашмат большая за Парыж... уся чырвоная і раўнюсенькая; увышыню ўзносяцца вежы і касьцёлы..., а праз горад цячэ Тама (Тэмза), па якой, што качкі, плывуць рачныя караблі...»

Памятаю, першае маё знаёмства з Англіяй зьвязанае было з кніжкай В.Скота «Эдынбурзкая вязьніца», якая нейкім чароўным чынам прыцягвала мяне ў пяцігадовым ўзросьце. Я хавалася ў кут і спрабавала чытаць. Гэтае адчуваньне таямніцы засталося на ўсё жыцьцё. Так Шатляндыя вызначыла маю цікавасьць да краіны, якую я ніколі дагэтуль не спадзявалася ўбачыць.

### Хітроў

Рухаючыся разам зь вялікім натоўпам уздоўж лябірынтаў аэрапорту, усё яшчэ адчуваеш сябе недзе паміж небам і зямлёю. Толькі спыніўшыся каля надзвычай пільнага супрацоўніка эміграцыйнай службы (з выгляду выкапанага Міка Джагера) і старанна адказаўшы на пытаньні, якія няпроста зьнянацку зразумець, бо перашкаджае моцны шатляндзкі акцэнт «Міка», я атрымліваю свой чырвоны пашпарт.

### Оксфард

Нечакана цёплы і ўтульны ў промнях пасьляпаўдзённага сонца горад патанае ў бела-ружовых аблоках. Усё квітнее: чарэшні, экзатычныя магноліі, рададэндраны. Кожны куток дыхае гісторыяй. Я пазнаю старасьвецкія вулачкі, камяніцы студэнцкага гарадка, бачаныя ў ангельскім дэтэктыўным сэрыяле пра інспэктара Морса.

З Англа-Саксонскай кронікі вядома, што невялічкае селішча «Окстэнфард» існавала ўжо ў 912 г. Збудаваны на берагох Тэмзы вакол хрысьціянскай бажніцы Meadow Оксфард хутка ператварыўся ў месца, якое прываблівала тутэйшых студэнтаў. Оксфард і цяпер — горад студэнтаў. Тлумы моладзі сустракаеш паўсюль, але асабліва шмат яе на зялёных берагох ракі, дзе ладзяцца пікнікі. Кожны мае магчымасьць спраўдзіць свае здольнасьці — пакіраваць чоўнам з дапамогаю доўгага кія. Чаўны нагадваюць вэнэцыянскія гандолы, але «гандальеры» не заўсёды добра спрактыкаваныя, таму воднае падарожжа часам сканчаецца «масавым купаньнем» — забавай ня самай прыемнай, бо дзьме пранізьлівы сівер.

### Бажніцы

У Англіі існуе мноства разгалінаваньняў хрысьціянства, таму нават у невялікай вёсцы сустракаеш некалькі бажніцаў, звонку практычна аднолькавых, бо збудаваных з каменя і нетынкаваных. Вясковы каталіцкі касьцёл, які я здолела адшукаць у мястэчку Чарлбэры, зусім не адпавядаў традыцыйным уяўленьням. Ён ня меў сьпічастых званіцаў або шыкоўнага фасаду. Сьціплы інтэр'ер упрыгожвалі толькі каляровыя вакониыя вітражы. Мясцовы ксёндз, вельмі пажылы ўжо чалавек, узрадаваўся, пачуўшы, што мае наведніцу з далёкай краіны. «Як гучыць прывітаньне па-беларуску?» — пацікавіўся ён. «Добры дзень», — адказваю. «Добры дзень», — чамусьці гаворыць сьвятар на разьвітаньне. Наступнага дня, калі мела адбыцца знаёмства зь вернікамі, уваходжу ў касьцёл і бачу на самым заўважным месцы паштоўку з выяваю алтара Гарадзенскага Фарнага касьцёла з набору, які я падаравала ксяндзу напярэдадні.

На імшы ў Вэстмінстарскім Абацтве нязвыкла бачыць чарнаскурую дзяўчыну ў вельмі стракатым уборы, пару кітайцаў, відаць, мужа з жонкай. Праводзяць вернікаў некалькі сьвятароў, паціскаючы кожнаму руку і пытаючыся пра краіну, адкуль паходзяць наведнікі. Пачуўшы пра Беларусь, айцец вымаўляе мне у адказ: «Oh a long way!» (О, гэта вельмі далёка)...

### Кавярні

Увечары ў Оксфардзкім унівэрсытэцкім пабе багата народу —разам і студэнты, і выкладчыкі. У той дзень шмат гаворкі пра Расею: акурат раніцой у газэтах зьявіліся паведамленьні пра чарговую шпіёнскую афэру: «russian spies» — трывожна далятае з розных куткоў. Адзін навуковец, які толькі што вярнуўся з Аўстрыі, апавядае пра славуты аўстрыйскі бюракратызм, а таксама пра візыт у Літву. Ён вельмі ўражаны дамарослым літоўскім снабізмам: лічаць сябе гістарычнымі нашчадкамі Вялікага Княства Літоўскага, а самі нялдольныя нават як мае быць адрэстаўраваць замак. Гэта ён пра Трокі, якія наведаў. Пра Беларусь увогуле няма чаго гаварыць, — кажа ён, — бо абгарадзілася жалезнай заслонаю, так што яму не атрымалася да нас заехаць, хоць жаданьне такое было...

У памяшканьні, якое нагадвае амфітэатар з кухняй усярэдзіне, смажацца разнастайныя мясныя стравы і млеюць апэтытныя гарніры. Па галоўную страву трэба самому спусьціцца ў гэты самы «кратэр». Ежу раскладаюць на абавязкова нагрэтыя талеркі, прычым у неабмежаванай колькасьці. Варта на хвіліну страціць увагу ды своечасова не спыніць кухара — і ўжо маеш столькі індычынага мяса, што не зьясі. Цікава назіраць пры гэтым, як чапурыстыя англікі цярпліва чакаюць, аж пакуль колькасьць мясной стравы на талерцы не дасягне «межаў неразумнага». Пасьля яды з кожнага ўсё адно возьмуць аднолькавую дастаткова вялікую суму, незалежна ад таго, колькі ты зьеў.

### Манчэстар

Індустрыйныя раёны паўночнай Англіі асацыююцца з комінамі заводаў, хімічным цяжкім паветрам. У прадмесьці — шэраг ахайна прыгожых і падобных адзін да аднога дамкоў, дзе жывуць рабочыя. Тут многа эмігрантаў, бо жыльлё досыць таннае і лёгка знайсьці працу. Чырвоная цэгла дамоў часам амаль да чарнаты закопчаная. Прыцягвае ўвагу назва, выпісаная на адным з дамоў: «Black brothers and Co». Сапраўды, чарнаскурыя — на кожным кроку. Невыпадкова тут значна часьцей, чымся ў цэнтральнай Англіі, сустракаюцца на вуліцах паліцыянты.

### Эдынбург і шатляндцы

«Горад для каханкаў» — чытаеш пра Эдынбург у рэклямным часопісе і пра сябе чамусьці называеш яго горадам-бастыёнам або суворым і велічным ваяром. Эдынбурская крэпасьць, збudаваная на скале, была месцам старажытных селішчаў і зьвязаная з найбольш выбітнымі гістарычнымі падзеямі. Дамінуючы над усім навакольлем, яна і сёньня — сымбаль гораду. Адсюль можна бачыць прыгожую панараму Эдынбургу з купаламі і шпілямі, стромкімі вежамі. Адчуўшы тут, у горадзе, сьвежасьць горнага паветра, раптам пачынаеш разумець, што ж нараджае славуты шатляндзкі вальналюбны характар і каталізуе нацыянальную сьвядомасьць. Гэта —шатляндзкія горы, паветра і гістарычная спадчына, якой яны вельмі даражаць.

Людзі поўначы вельмі адрозныя сваім характарам ад тыповых англікаў. Спачатку здаецца вельмі дзіўным, што шафёр таксоўкі ці ўладальнік невялікага паба пачынае распавядаць табе апошнія цікавосткі, дае парады пра месцы, якія варта наведаць у першую чаргу. Але да гэтага хутка прызвычайваесься і з задавальненьнем прымаеш гэтую нечаканую адкрытасьць. Ужо не здаецца дзіўным, што практычна ўсё адзеньне, выстаўленае ў вітрынах, абавязкова ў шатляндзкую кратачку, усіх магчымых спалучэньняў колераў, а ў жаўнера, апранутага у камуфляжны камбінэзон, на галаве бэрэт у тую ж самую кратачку з пампонам. «А дзе ж знакамітыя шатляндзкія спадніцы?» Мне тлумачаць, што цяпер узгадваюць пра гэтую традыцыю хіба што перад вясельем, вось тады ўжо нацыянальная вопратка амаль абавязковая. Перад ад'ездам, нібыта абвяржэньне гэтых словаў, сустракаю ў цэнтры Эдынбургу маладога шатляндца зь дзяўчынай. Ён апрануты ў шатляндзкі строй, у яе руках кветкі, на тварах — прыязная ўсьмешка. Але гэта было зусім не вясельле.

**Сьвятлана Клімовіч**

*Горадня — Вялікабрытанія — Горадня*





**Конкурс**

# Стары гарадзкі краявід

Чым адрозьніваецца гарадзкая вуліца ад вясковай? На вясковых вуліцах можна сядзець. На прызьбе, на лаўцы, на ўслончыку. Альбо стаяць, абапершыся на штакетнік ці весьніцы, і з усімі вітацца, праводзіць позіркам кожнага мінака, чакаць, калі прыгоняць каровы.

У горадзе на вуліцах не сядзяць, па іх рухаюцца бясконца. Вуліцы гораду — гэта артэрыі колішняе культуры. Па гарадзкіх вуліцах пераносіліся моды, найноўшыя вынаходніцтвы, новая музыка і новае мастацтва. Так было заўсёды. Калі запальваліся першыя газавыя ліхтары, калі зьявіўся першы аўтамабіль, калі разгортвалі шапіто цырку ці калі прыязджаў дэкляматар альбо музыка, пра што паведамлялі публікаткі на ўсіх тутэйшых мовах на адмысловых слупах і тумбах, якія сталі неад'емнаю часткаю беларускіх местаў і мястэчак напрыканцы XIX ст.

Сёньня мы дазнаемся пра мастацтва, моду і навіны ў сваіх дамах, з тэлевізійных, транзыстарных і паштовых скрыняў. А па вуліцах проста перамяшчаемся, з кожным годам усё хутчэй і хутчэй... А было б напэўна прыемна павітацца з чысьцільшчыкам ботаў, з тачыльшчыкам, з фурманам ля параднага і ад хлопца -разносьчыка газэтаў паслухаць, пра што пішуць. Па-нашаму, па-расейску, па-польску, па якому хочаш!.. Карацей, пажыць вуліцаю старога нашага места, па якой хадзілі трубачысты, мніхі, ліхтарнікі, катрыншчыкі, дворнікі...

Што за вуліца на гэтым здымку? Які гэта горад? Гэта апошнія пытаньні нашага конкурсу. Чакаем адказаў.

**Сяргей Харэўскі**




# Залаты фонд

Сэрыя касэтаў «Залаты фонд беларускага рок-н-ролу» — гэта працяг перавыданьня старых запісаў, чым выдавецтва «Каўчэг» займаецца на працягу апошняга году. Тры першыя тамы (зь пяці заплянаваных) выклікаюць розныя пачуцьці. Пачнем з прыемнага — з настальгіі.

Некаторыя «старыя» дагэтуль маюць у сваіх калекцыях вінілы «Мелодии» — «Хіт-парад Беларускай Маладзёжнай», — якія выйшлі напрыканцы 80-х. Першыя два тамы сэрыі ўвабралі сапраўды «залатыя» хіты канца 80-х: «На станцыі Койданава» і «Твая Атлянтыда» *Бонды* на вершы Адама Глёбуса, «Вартаўнік» і «Будзе так» *Мясцовага Часу*, «Гуляй, душа», «Я рок-музыкант» і «Так і трэба» *Мроі*, «Радыё Свабода» і «Пляц Францыска» *Уліса*. Усё гэта, разам з больш позьнімі хітамі *Новага Неба* і *Крамы*, дае файнае спалучэньне настальгіі і новых эмоцыяў.

Пачуцьцё нумар 2: зьдзіўленьне. Яго выклікае зьмест трэцяга тому сэрыі. Калі яшчэ *Сузор'е* ці *Заруіто* зь вядомай «Люлілякай» могуць лічыцца залатым фондам беларускага року, то наўрад ці знойдзецца сёньня чалавек, які чмурэе ад «хіта» «Совтрансавто» *(Золотая Середина)*, альбо «Гласность» (што за *Гранит* такі быў?)...

Гэтая недарэчнасьць не псуе, праўда, агульнага настрою. Калі апошнія дзьве касэты будуць мець такога ж узроўню падборку як і першыя, то сэрыя атрымае відавочны посьпех (калі ўлічыць яшчэ, што вырасла маладая генэрацыя аматараў, якія ня чулі ні *Бонды*, ні *Мясцовага Часу*). Хіба што пры набыцьці касэтаў будзе выпадаць том №3.

**Андрэй Андрыеўскі**

© НАША НІВА Спасылка на "Нашу Ніву" абавязковая Наклад 5100 Нумар падпісаны ў друк 19⁵⁵, 18/8/1996. Друкарня выдавецтва "Беларускі Дом друку". Менск, праспэкт Францішка Скарыны, 79. Замова № 4582 Кошт свабодны.